Падрыхтоўка крывавай інтэрвэнцыі і пасьледуючай страшэннай рэакцыі на дзесяткі год—

воєсь стаўка меншавікоў і II Інтэрнацыяналу

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 66 (3970)
ПАНЯДЗЕЛАК, 9 САКАВІКА
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

КОЖНЫ МЕНШАВІК—ВОРАГ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ, ВОРАГ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

СПРАВА КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ МЕНШАВІКОЎ

Ранішняе пасяджэньне не 7 сакавіка

АБАРОНЧАЯ ПРАМОВА ПАДСУДНАГА ГРОМАНА

— Абараняць мяне няма чаго, — кажа Громан, — бо я прызнаў сваю віну і на працягу судовага працэсу імкнуўся выкрыць усё тое, што мне вядома аб контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці меншавіцкай арганізацыі і II Інтэрнацыяналу.

Але мая роля ў арганізацыі прымушае мяне вытлумачыць прычыны, што прывялі мяне да таго ланцуга «заблуждений» і цяжкіх злачынстваў, якія зьяўляюцца прадметам судовага разгляду.

Громан расказвае гісторыю меншавізму, яго барацьбу з бальшавізмам і тое, як меншавізм паступова скаціўся ў балота контр-рэвалюцыі.

— Я ўсьвядоміў усю глыбіню злачынстваў супроць рабочай клясы, усьвядоміў усю глыбіню маіх «заблуждений». Зразумеў крыніцу маіх злачынстваў. Крыніца гэта адна, калі гаварыць у навуковых тэрмінах. Гэта адыход ад навукова-рэвалюцыйнага сацыялізму да рэфармісцка-апартуністычнага сацыялізму. Гэта сьвядомасьць прывяла мяне да неабходнасьці разброіцца, да неабходнасьці сказаць, што мы зьяўляемся прадстаўнікамі тэй плыні, якая страціла права на існаваньне. Мы былі тымі, хто служыць інтарэсам і мэтам буржуазіі. Для савецкай улады гэта ўжо ясна, як дзень. Ужо няма рабочых меншавікоў у краіне Саветаў. На Захадзе ёсьць яшчэ рабочыя, якія ідуць за рэфармісцкай сацыял-дэмакратычнай партыяй. Сусьветны пралетарыят атрымае цяпер матар'ял, па якім ён зможа ацаніць усю ступень небясьпецкі паўтарэньня ў яшчэ большай меры таго факту сацыял-здрадніцтва, якое было зроблена ў сусьветную вайну, я разумею арганізацыю інтэрвэнцыі супроць першай рабочай дзяржавы, што будуе сацыялізм, дзяржавы пралетарскай дыктатуры.

Вярхоўнаму суду прадстаўць вызначыць меру сацыяльнай абароны супроць мяне. Магу сказаць толькі адно Вярхоўнаму суду, — калі мне будзе даравана жыцьцё, дык усе мае сілы, усе мае веды ўжыву на тое, каб працаваць над ажыцьцяўленьнем генэральнай лініі партыі і над яе кіраўніцтвам, нават у тых, быць можа, суровых умовах, у якія паставіць мяне савецкая ўлада. Без магчымасьці гэтай работы мне жыцьцё непатрэбна. Мне трэба загладзіць хаця-б у малой меры тыя вялізарныя цяжкія злачынствы, якія я, як кіраўнік контр-рэвалюцыйнай школьніцкай арганізацыі, зрабіў, падрыхтоўваючы інтэрвэнцыю, стварэньні блёк з контр-рэвалюцыйнымі партыямі.

Калі, паўтараю, мне будзе дараваны жыцьцё, я яго скарыстаю на тое, каб загладзіць хаця-б у малой меры гэта вялікае маё злачынства.

Прамова падсуднага Громана цягнулася 2 гадзіны.

АБАРОНЧАЯ ПРАМОВА ПАДСУДНАГА СУХАНАВА

Суханаў падрабязна выкладае свае погляды на расійскі і міжнародны меншавізм. Суханаў гаворыць:

— Сучасны меншавізм вынікае з усёй яго мінулай гісторыі. І ў Кастрычніцкую рэвалюцыю меншавікі засталіся вернымі сабе. У грамадзянскую вайну меншавікі патрабавалі спыненьня вайны, што па сутнасьці азначала-б капітуляцыю савецкай улады перад унутранай контр-рэвалюцыяй і інтэрвэнтамі. Сучасны меншавізм — гэта фундамант буржуазна-капіталістычнага грамадзтва, — гаворыць Суханаў. Міжнародная сацыял-дэмакратыя — гэта апарат для пранікненьня ідэй буржуазнай дзяржавы ў рабочыя масы. Без сацыял-дэмакратыі зараз у краінах капіталу кіраваць нельга. Суханаў гаворыць, што ён цяпер выразна разумее, што гістарычная місія сацыял-дэмакратыі — гэта ўмацаваньне дыктатуры капіталу. Пераходзячы да ацэнкі пляцформы рускіх меншавікоў, прынятай у 1924 годзе, якая дзейнічае і да гэтага часу, Суханаў канстатуе, што ў гэтай праграме меншавікі ставяць сваёй мэтай пасьля зьвяржэньня савецкай улады зварот капіталістам фабрык і заводаў, памешчыкам — зямлі. У руках-жа дзяржавы заставалася-б тое, што было пры царскім ладзе.

Падтрыманьне інтэрвэнцыі вынікае з усёй палітыкі і прыроды сацыял-дэмакратыі. Гістарычная-ж задача міжнароднага і рускага меншавізму ў падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць СССР заключаецца ў тым, — гаворыць Суханаў, — каб зьнішчыць асноўную перашкоду капіталістаў, якая не дае ім магчымасьць пачаць ваенны паход супроць краіны пралетарскай дыктатуры. Меншавікі стараюцца ўсяляк дыскрэдытаваць, навесьці паклёп на СССР, на яго ўрад, яго палітыку, яго гаспадарку ў вачох міжнароднага пралетарыяту і пераканаць рабочых у нямінучасьці правалу краіны пралетарскай дыктатуры.

«Форвэртс» — цэнтральны орган міжнароднай сацыял-дэмакратыі, — гаворыць далей падсудны, — самая варожая на земнай кулі газэта супроць СССР. «Форвэртс» заблысчачаецца матар'ялам для цкаваньня СССР рускімі меншавікамі. Гэта ёсьць самая істотная спрафундная інтэрвэнцыяністская работа, якую ўласьціва выконваць імёнам сацыял-дэмакратам. Пераходзячы да аналізу сваёй ролі, сваіх настроў і перакананьняў пры савецкай уладзе, Суханаў гаворыць, што ваенны камунізм ён сустрэў надзвычай варожа і расцэньваў яго, як вялізарнейшае зло. Працягваючы працаваць пры савецкай уладзе, ён варожа адносіўся да гэтай улады. З наступленьнем НЭП'у ён крыху «палявёў», спадзяючыся на капіталістычнае перараджэньне савецкай улады. З пераходам-жа савецкай улады ў сацыялістычнае наступленьне, ён траціць усякую надзею «на спуск тармазоў» савецкай улады да капіталізму.

Падрабязна расказваючы аб усіх сваіх «хістаньнях» ад падтрыманьня адкрытай контр-рэвалюцыі да лібэральных адносін да савецкай улады, Суханаў гаворыць, што «ў 1928 годзе ён быў гатоў уступіць у саюз з меншавікамі, эсэрамі і кулакамі і самім чортам толькі-б скінуць савецкую ўладу».

Таму ён прыняў прапанову Громана, уваўшоў у контр-рэвалюцыйную школьніцкую арганізацыю меншавікоў. Гэта было. На гэтым ён канчае сваю прамову. Ён спадзяецца растлумачыць суду сутнасьць сваёй памылкі ў апошнім слове.

Абвяшчаецца перапынак да вечара.

Вячэрняе пасяджэньне 7-га сакавіка

На вячэрнім пасяджэньні 7 сакавіка працягваліся спрэчкі бакоў. З абарончымі прамовамі выступілі падсудныя: Шэр, Гінзбург, Якубовіч, Залкінд, Рубін.

ПРАМОВА ПАДСУДНАГА ШЭРА

Падсудны Шэр гаворыць аб сваім палітычным шляху, як шляху меншавізму, як аб здрадзе інтарэсам рабочае клясы.

Уся контр-рэвалюцыйная дзейнасьць меншавіцкай арганізацыі супроць савецкай улады праводзілася паводле дырэктыў заграничнай далегацыі меншавікоў, пры непасрэдным падтрыманьні II Інтэрнацыяналу, — кажа падсудны. Гэты працэс паказаў, што на ўсіх асноўных пытаньнях контр-рэвалюцыйнай работы меншавіцкай арганізацыі «саюзное бюро» атрымлівала ад заграничнага меншавіцкага цэнтру дырэктывы. Контр-рэвалюцыйныя злачынствы, якія зрабіў я, — гэта злачынствы ўсяго II Інтэрнацыяналу. Кожны меншавік павінен ведаць, што ўся барацьба, якую мы вялі супроць савецкай улады, зводзіцца да контр-рэвалюцыйнай работы супроць дыктатуры пралетарыяту. Кожны меншавік — вораг рабочай клясы, вораг сацыялістычнага будаўніцтва. Меншавізм нераварыўся ў контр-рэвалюцыйную партыю.

У заключэньне падсудны Шэр просіць Вярхоўны суд даць яму магчымасьць правесьці рэшту жыцьця ў барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва.

ПРАМОВА ПАДСУДНАГА ГІНЗБУРГА

З 1907 году падсудны Гінзбург працаваў у сацыял-дэмакратычнай арганізацыі. Кастрычніцкая рэвалюцыя для Гінзбурга была «небясьпечным экспэрыментам». Ён лічыў, што ў краіне няма асноў для сацыялістычнага будаўніцтва. Рашучае сацыялістычнае наступленьне штурхнула меншавікоў на актыўнае змаганьне супроць савецкай улады. Барацьба з знанамічнай палітыкай савецкай улады нямінуча ператварылася ў барацьбу супроць савецкай улады. Меншавіцкая арганізацыя ставіла стаўку на рэстаўрацыю капіталістычных адносін у СССР. Правы ўхіл УсеКП(б) ажыў надзеі меншавікоў на перамогу капіталістычных адносін. Дырэктывы заграничнай далегацыі меншавікоў і II Інтэрнацыяналу давалі выразнае ўказаньне на мэтад барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту. Ня гледзячы на ўсе школьніцкія работы, якія праводзілі меншавікі, у СССР з посьпехам разгортваецца будаўніцтва сацыялізму. У пазьнасьці ўсе магчымасьці для пасьпяховага будаўніцтва. Мы тэрлялі рукі на лад пралетарскай дыктатуры, мы прабавалі сарваць сацыялістычнае будаўніцтва, — гаворыць падсудны Гінзбург. Апрача нас ёсьць яшчэ элементы, якія і зараз яшчэ ня спыняюць школьніцкай справы. Гэту палітыку настойліва праводзіць II Інтэрнацыянал. Пралетарыят усяго сьвету ня можа і не павінен ні ў найменшай меры заставацца пасыўным перад тварам гэтай здрадніцкай палітыкі. Рабочыя капіталістычных краін павінны зразумець, што II Інтэрнацыянал падтрымлівае фінансавую блёкаду, вядзе шалёную прапаганду супроць Савецкага Саюзу, рыхтуе інтэрвэнцыю супроць краіны Саветаў.

Я поўнасьцю прызнаў свае злачынствы перад рабочай клясай. Я зразумеў усю тую вялізарную шкоду, якую контр-рэвалюцыйная меншавіцкая арганізацыя прынесла рэвалюцыйнаму рабочаму руху.

Падсудны просіць даць яму магчымасьць рэшту жыцьця аддаць справе рэвалюцыі.

ПРАМОВА ПАДСУДНАГА ЯКУБОВІЧА

Падсудны Якубовіч у сваёй прамове падрабязна спыняецца на тых пунктах і матывах, пад уплывам якіх ён стаў на шлях здрады рабочай клясе. Я, — кажа падсудны, — будучы актыўным прыхільнікам інтэрвэнцыі, знаходзіўся ва ўладзе адной думкі: улада ў выпадку інтэрвэнцыі апынецца ў руках найбольш актыўнай буржуазнай групы, якая зможа ў момант пераварот захваціць і ўтрымаць яе. Я прыйшоў таму да думкі, што неабходна аб'яднацца з ранейшымі таварышамі па меншавіцкай партыі, каб потым працягнуць руку да улады. Я ўступіў у арганізацыю. Апрача інтэрвэнцыі разьлік быў на разлажэньне камуністычнай партыі. Але распад камуністычнай партыі ня было. І ў нас зьявілася думка абвастрыць унутранае становішча, каб гэтым стварыць умовы і паскорыць распад партыі ў момант наступленьня перавароту.

Мы ніколі-б самі не адважыліся на тактыку шкодніцтва, калі-б у нас ня было кіруючых указаньняў заграничнага меншавіцкага цэнтру. Мы-ж, меншавікі, ніколі рашучасьці ў сваіх дзеяньнях не выяўлялі. Але заграничная далегацыя, даваўшая нам ясную катэгарычную дырэктыву наконт шкодніцтва, і сама на сваёй страх не адважылася-б на падобныя дзеяньні, калі-б ня мела наконт гэтага ўхвалы з боку II Інтэрнацыяналу. Але было-б няправільна, калі-б мы ўсю адказнасьць узвалвалі толькі на членаў заграничнага цэнтру. Яна ляжыць і на іх, і на нас, бо мы-б іх не паслухалі, калі-б самі ня былі гатовы для ўспрыняцьця выходзячых з-заграніцы дырэктыў. Такава сума ідэй,—кажа Якубовіч, — пад уплывам якіх мы рабілі нашы контр-рэвалюцыйныя шкодніцкія і інтэрвэнцыяністкія дзеяньні.

У заключэньне, падсудны заяўляе, што ён разбройваецца перад савецкай уладай і раскайваецца ва ўсіх сваіх злачынствах перад рабочай клясай.

ПРАМОВА ПАДСУДНАГА ЗАЛКІНДА

Падсудны Залкінд пачынае сваю заключную прамову з указаньня, што яму больш цяжка, чым большасьці падсудных, гаварыць аб сабе, бо сваю палітычную дзейнасьць ён распачаў у радох бальшавіцкай партыі. Падрабязна спыняючыся на эвалюцыі свайго палітычнага «крэдо» ў дарэвалюцыйныя гады, Залкінд кажа:

— Я даволі хутка адышоў ад бальшавікоў таму, што на сваёй інтэлігенцкай сутнасьці ня мог прыняць бальшавіцкай формулы аб палітычнай дыктатуры пралетарыяту.

ПРАМОВА ПАДСУДНАГА РУБІНА

— Я хачу, — кажа падсудны Рубін,— разброіцца поўнасьцю ня толькі ў сэнсе адрачэньня ад сваёй мінулай палітычнай дзейнасьці, але і разброіцца ідэёна. Я прышоў да найглыбейшага і шчырдлага перакананьня, што меншавіцкая ідэалёгія, якая адмаўляе сацыяльны характар Кастрычніцкай рэвалюцыі, савецкае будаўніцтва, зьлучаецца да мазга касьцей хлусьлівай і шкодніцкай.

Раніцняе пасяджэньне 8-га сакавіка

ПРАМОВА ПАДСУДНАГА САКАЛОЎСКАГА

Пасяджэньне аднаўляецца абарончай прамовай Сакалоўскага. Надзеі меншавікоў на катастрофу бальшавізму в разгорнутым сацыялістычным наступленьнем разбурыліся. Ад выкананьня дырэктыў заграничнага меншавіцкага цэнтру, пры падтрыманьні II Інтэрнацыяналу, меншавіцкая арганізацыя перайшла да шкодніцкай дзейнасьці, да блёку з контр-рэвалюцыйнымі партыямі, да стаўкі на інтэрвэнцыю. «Мы спадзяваліся, — кажа падсудны Сакалоўскі, — на тое, што II інтэрнацыянал зможа апрацаваць рабочыя масы і выклікаць у іх пасыўныя адносіны да інтэрвэнцыі супроць краіны Саветаў. Але гэта не ўдалося. Рабочыя масы ўнутры СССР усё-ж за намі не пайшлі, нават пасобных рабочых мы не змаглі завербаваць у сваю арганізацыю. Патаемна мы падтрымлівалі інтэрвэнцыю, але адкрыта мы павінны былі стаць на сацыялістычнай пляцформе».

Падсудны прызнае ўсе свае злачынствы перад рабочай клясай. Пытаньне стаіць проста: або ісьці адкрыта з буржуазіяй на адкрытую рэстаўрацыю капіталізму, або добрасумленна прымаць удзел у сацыялістычным будаўніцтве. Я поўнасьцю разброіваюся і прашу Вярхоўны суд даць мне магчымасьць актыўна браць удзел у сацыялістычным будаўніцтве.

ПРАМОВА ПАДСУДНАГА ІКАВА

Падсудны Ікаў у сваёй абарончай прамове гаворыць аб цясьнейшай сувязі паміж контр-рэвалюцыйнай работай «саюзнага бюро» і заграничным меншавікім цэнтрам. Лінія II Інтэрнацыяналу — гэта лінія на зьвяржэньне савецкай улады. Меншавікі разьбіты ўшчэнт, і я назаўсёды спыняю барацьбу супроць савецкай улады, бо я прайшоў увесь шлях да канца разам з партыяй і зайшоў у тупік. Дарога ў рабочыя масы для меншавіцкай партыі закрыта назаўсёды. Відавіцкая работа меншавікоў не сустракае ні найменшага падтрыманьня ў рабочых масах. Падсудны просіць суд даць яму магчымасьць скарыстаць свае веды на справу сацыялістычнага будаўніцтва.

ПРАМОВА ПАДСУДНАГА ПЯТУНІНА

Падсудны Пятунін поўнасьцю прызнае свае злачынствы перад рабочай клясай. «Мы аказаліся,—гаворыць ён,— на той бок барыкад, у лагеры ворагаў пралетарыяту, абярнуліся ў адрэнкаў рабочае клясы. Контр-рэвалюцыйная меншавіцкая арганізацыя змагалася за ўстанаўленьне капіталізму ў краіне Саветаў. У гэтым ёй актыўна дапамагалі яе кіраўніцтвам, так і сродкамі заграничны меншавіцкі цэнтр і 2-гі Інтэрнацыянал». Падсудны просіць суд даць яму магчымасьць прымаць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве.

АБАРОНЧАЯ ПРАМОВА ПАДСУДНАГА БЭРЛАЦКАГА

Падсудны Бэрлацкі кажа, што ён прайшоў усю меншавіцкую школу, у ёй ён выхаваўся ў духу нявер'я ў сілы рабочай клясы, нявер'я ў магчымасьць перамогі рабочае клясы, нявер'я ў творчыя магчымасьці рабочае клясы. Ён лічыў, што ў адсталай Расіі немагчымая перамога пралетарскай рэвалюцыі. Кастрычніцкую рэвалюцыю, ён лічыў асуджанай на пагібель, ня веріў у яе перамогу. Наступленьне НЭП'у, — кажа Бэрлацкі, — я вразумеў як генэральнае адступленьне. Пры гэтым ён лічыў, што народную гаспадарку можна адкавіць толькі з дапамогай замежнага капіталу. У пачатку шляхам легальных выступленьняў Бэрлацкі прабуе даказаць немагчымасьць адкавіць народную гаспадарку без прыцягненьня замежнага капіталу. Ён патрабуе папыраньня НЭП'у за кошт узмацненьня капіталістычных элемэнтаў, за кошт адачы панаўнай рабочай клясай. Але, з прычыны таго, што легальныя выступленьні ня прывялі да ніякіх вынікаў, Бэрлацкі перайшоў да падпольнай контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай работы, уступіў у меншавіцкую арганізацыю. Толькі цяпер ён зразумеў усю глыбіню яго здрадніцтва інтарэсам рабочае клясы. «Я зразумеў,— кажа Бэрлацкі, — што адзіна прапільная лінія ў інтарэсах рабочае клясы — гэта лінія савецкай улады. Сапраўдная барацьбаўшчына рабочае клясы ўсяго свету — Савецкая краіна. Я шчыра і сумленна кажу, што Савецкая краіна—краіна, якая будуе сацыялізм».

Бэрлацкі просіць суд, калі яму будзе захавана жыцьцё, даць магчымасьць прыдажыць усе свае сілы, увесь свой вопыт, усе свае веды для работы на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва і гатым у якой-небудзь меры загладзіць сваё здрадніцтва.

Далей суд пераходзіць да заслухоўваньня апошняга слова падсудных.

Апошнія словы падсудных

АПОШНЯЕ СЛОВА СУХАНАВА

Першы гаворыць Суханаў. Зноў спыняючыся на сваіх настроях і перакананьнях, на прычынах уступленьня ў шкодніцкую арганізацыю, Суханаў гаворыць, што жыцьцё і факты прывялі яго да перакананьня, што ён ня меў рацыі, што ён цяпер цьвёрда перакананы, што пралетарская дыктатура прызвана ажыцьцявіць вялікія гістарычныя задачы. «Я веру, што УсеКП(б) сваім мэтадам, сваёй арганізацыяй, сваёй палітыкай перамагае».

АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА ВОЎКАВА

«Я ня мог, як многія з маіх таварышоў, — гаворыць падсудны Воўкаў,—прыйсьці да разбраеньня шляхам тэарэтычнага ўзважваньня ва і супроць, шляхам глыбокага сацыяльна-палітычнага аналізу. Я «прозрел» інакш. Ужо ў апошні час я «тяготился» тэй абстаноўкай, у якую трапіў. Я ўжо вёў перагаворы аб сваім адыходзе на вытворчасьць. Галоўным, аднак, штуршком, які паставіў мяне на шлях разбраеньня і паказаў мне, контр-рэвалюцыйнае балота, у якое скаціўся меншавізм, — гэта быў працэс «прампартыі». Там я навочна пераканаўся, у якія нетры я зайшоў разам з меншавіцкай арганізацыяй».

«У царскія часы,—заканчвае падсудны, — нам лёгка было ісьці на катаргу і ў ссылку, бо мы не адчувалі ні ценю раскаяньня ў зробленых намі рэвалюцыйных справах. Ня тое цяпер... мая просьба да суда — аьмякчыць лёс маіх таварышоў і мой асабіста і даць нам усім магчымасьць актыўна браць удзел у сацыялістычным будаўніцтве, якое разгортваецца».

АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА ФІН-ЕНАТАЕЎСКАГА

Падсудны заяўляе, што яго прасьледуе пачуцьцё сораму, пачуцьцё ганьбы. Слова раскаяньне — слабое слова, — гаворыць Фін-Енатаеўскі. Я прашу Вярхоўны суд даць мне магчымасьць тыя памногія гады, што засталіся да канца майго жыцьця, весьці работу на карысьць СССР і сусьветнага пралетарыяту».

АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА ТЭЙТЭЛЬБАУМА

Падсудны Тэйтэльбаум успаміне словы Пляханава, якія ён тут чуў: «Ёсьць арганізацыі, найвялікшае злачынства якіх перад гісторыяй заключаецца ў тым, што яны існуюць». Да такой катэгорыі арганізацый падсудны адносіць і меншавіцкую контр-рэвалюцыйную арганізацыю. «Адзіная задача майго жыцьця, — заканчвае Тэйтэльбаум, — заключаецца ў тым, каб весьці бязьлітасную барацьбу з тымі, каго я прызнаю зьлейшымі і самымі небясьпечнымі ворагамі рабочае клясы — з меншавікамі. Я поўнасьцю разброіўся і прашу суд верыць у гэта».

АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА ГРОМАНА

Падсудны Громан яшчэ раз гаворыць аб сваім поўным і шчырым разбраеньні і ў заключэньне заўважае «лякай суд выраняць ці можна пры ўсім тым, што ён велае аба мне, ацаніўшы таксама мае паводзіны ў часе судовага сьледзтва, верыць гэтай маёй заяве і даць мне магчымасьць жыць і весьці работу на карысьць Савецкага Саюзу».

АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА ГІНЗБУРГА

— Яшчэ раз пацьвярджаю сваю заяву аб тым, што я гатоў аддаць усе свае сілы на сацыялістычнае будаўніцтва, на барацьбу за сусьветную рэвалюцыю. Калі суд знойдзе магчымым захаваць мне жыцьцё, то я абяцаю аддаць яго цалкам сацыялістычнаму будаўніцтву.

АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА ЯКУБОВІЧА

— Я ўжо расказаў у сваёй так званай абарончай прамове, як я прыйшоў да ўдзелу ў контр-рэвалюцыйнай арганізацыі і як я цяпер адношуся да яе дзейнасьці. Я аддаю сваё жыцьцё для пралетарскай дзяржавы.

АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА ЗАЛКІНДА

— Я яшчэ раз хачу сказаць суду, што захаваньне мне жыцьця без працаваньня мне магчымасьці ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве — для мяне ня мае цаны.

АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА РУБІНА

— Для мяне, як і для іншых падсудных, — гаворыць Рубін, — быць без работы і дзейнасьці — ня мае цаны. Я прашу даць мне магчымасьць і выпрабаваць пачуцьцё чалавека, які не змагацца ўпарта супроць магутнага патоку пралетарскай працы і энтузіязму, а які ідзе разам з гэтым патокам, уліваючы ў яго ўсе свае сілы і адчуваючы сябе зоць маленькай, але карыснай, часткай.

АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА САКАЛОЎСКАГА

— Я прашу суд улічыць, што ўсе меншавіцкія масы я спаліў. Вяр удзелу ў рабоце для рабочай клясы і сацыялістычнага будаўніцтва я ня мыслю далейшага жыцьця.

АПОШНЯЕ СЛОВА ПАДСУДНАГА БЭРЛАЦКАГА

— Я ўсё сказаў у сваёй абарончай прамове. Дадам толькі, што я ўвесь тару жаданьнем усю сваю энэргію, свае сілы і веды аддаць на службу рабочай клясе і першай у сьвеце пралетарскай дзяржаве.

Падсудныя Ікаў, Шэр і Пятунін ад апошняга слова адмовіліся.

У з гада. 20 хвіл. суд выходзіць на нараду.

Прыгавару можна чакаць каля 10 гадзіны раніцы 9 сакавіка.

АДКРЫЎСЯ 6-ты ЗЬЕЗД САВЕТАЎ СССР

МАСКВА. 8 сакавіка ў Рэлікім тэатры ва ўрачыстай абстаноўцы адкрыўся 6-ты зьезд саветаў СССР. К 6 гадзінам памяшканьне тэатру пераполучена. На трыбуне зьяўляюцца т. т. СТАЛІН, КАЛІНІН, МОЛАТАЎ, ВАРАШЫЛАЎ, АРДЖАНІКІДЗЭ, РУДЗУТАК, КІРАЎ І ПЯТРОЎСКІ. Дэлегаты зьезду сустракаюць іх бурнымі апляўдысмэнтамі.

З напружанай увагай зьезд заслухоўвае ўступную прамову старшыні ЦВК СССР тав. КАЛІНІНА.

РАЗДУШЫЦЬ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ ГАДЗІНУ--

ПАТРАБУЮЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ БССР

Хваля абуроньня контр-рэвалюцыйнай дзейнасьцю меншавікоў-інтэрвэнцыяністаў, якія ў саюзе з «прампартыяй», кулацка-сялянскай партыяй Кандрацьцева-Чаянава, «Торгпромом» на сродкі імпэрыялістаў і II Інтэрнацыяналу імкнуліся патапіць у крыві першую ў сьвеце пралетарскую дзяржаву з тым, каб увесьці зноў уладу памешчыкаў і капіталістаў, — ахапіла самыя глухія куткі Савецкай Беларусі. Усюды працоўныя ў сваіх рэзалюцыях пратэсту патрабуюць бязьлітаснага пакараньня для шкоднікаў-меншавікоў — агентаў Пуанкарэ-вайны, Чэмбэрлена.

Працэс над контр-рэвалюцыйнай бандай меншавікоў узьняў новую магутную хвалю творчага энтузіязму. Рабочыя фабрык і заводаў, калгасьнікі, саўгасьнікі і працоўнае селянства ў адказ на шкодніцкую дзейнасьць меншавіцкай банды цясьней згуртоўваюць рады вакол партыі Леніна, узьнімаюць на вышэйшую ступень сацспаборніцтва і ўдарніцтва, перадаюць лепшых рабочых-ударнікаў у партыю Леніна, наладжваюць суботнікі па дапамозе транспарту, адказваюць чырвонымі абозамі па вывазцы лесаматар'ялаў і г. д.

Так, рабочыя і служачыя саўгасу Сьвіслач імя Сьвярдлова ва ўхваленай рэзалюцыі-пратэсту ганьбяць адзначкі рабочае клясы — меншавікоў-інтэрвэнцыяністаў. Рабочыя патрабуюць ад пралетарскага суда самага суровага пакараньня для контр-рэвалюцыйнай меншавіцкай арганізацыі.

У адказ на контр-рэвалюцыйную вылазку Громана, Суханава і інш. прыхвасьняў імпэрыялістаў абвязваюцца правесьці веснавую пасэўную кампанію на 5 дзён раней тэрміну, а таксама правесьці кампанію па 100 проц. зьбераженьні сьвінога маладняка і рагатай жывёлы.

Агульны сход абавязваецца весьці бязьлітасную барацьбу з прагуламі і нядбайнасьцю, рацыянальна і эканомна выдаткоўваць кармы і матар'ялы.

Агульны сход абавязвае рабочком узмацніць работу ў напрамку разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, стварэньні ударныя брыгады ў пасобных галінах сельскай гаспадарні. Калектыў калгасу нападжвае нядзельнік у саўгасе. Апрача таго калгасны калектыў перадае чатырох лепшых рабочых-ударнікаў у рады партыі.

— Агульны сход рабочых с.-г. майстэрань млыну «Ўсход» ганьбіць контр-рэвалюцыйную дзейнасьць меншавікоў-інтэрвэнцыяністаў і II Інтэрнацыянал. Рабочыя абвяшчаюць сябе мабілізаванымі па ліквідацыі прарываў. 13 чалавек падалі заявы аб уступленьні ў партыю і 3 чал. — у камсамол.

Чырвоны абоз па вывазцы лесаматар'ялаў

Сяляне-бядняки і середнякі в. Кляцішына, Сінчанскага сельсавету, Пухавіцкага раёну, у адказ міжнародным дранежнікам, падпальчыкам новай вайны супроць СССР, а таксама іх агентам—контр-рэвалюцыянэрам—меншавікам арганізавалі чырвоны абоз па вывазцы лесаматар'ялаў з 70 фурманак. Заробленыя за гэты дзень грошы сяляне ўносяць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў».

100 гэкт. ільну звыш пляну--

вось наш адказ меншав'кам

Габочыя саўгасу Боркавічы ганьбяць контр-рэвалюцыянэраў-меншавікоў і II Інтэрнацыянал — гэтых натхніцеляў і арганізатараў узброенага нападу на Савецкі Саюз — і патрабуюць ад савецкага ўраду вышэйшай меры пакараньня для ўсіх шкоднікаў.

У адказ на шкодніцтва меншавікоў-інтэрвэнцыяністаў рабочыя патрабуюць выпуску новай пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі». Адначасова рабочыя ставяць сваёй баявой задачай засеяць звыш пляну 100 гакт. ільну.

Абвяшчаюць сябе ўдарнымі

У адказ на шкодніцкую работу выкрытых контр-рэвалюцыянэраў-меншавікоў рабочыя саўгасу «Вызваленьне» яшчэ больш згуртоўваюць сваё рады вакол камуністычнай партыі для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады. Рабочыя абвяшчаюць сябе ўдарнымі на ліквідацыю ўсіх прарываў у саўгасе, уключаюцца ў дэкаду па праверцы слэсьбы.

— Рабочыя і служачыя шклоўскай фабрыкі «Барацьба» ўносяць на пабудову дырыжабля імя «Правды» аднадзенны заработак.

130 лепшых трактарыстаў у Ленінскі камсамол

Агульны камсамольскі сход рабочых МТС г. Шклова, заслухаўшы інфармацыю аб контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці меншавіцкіх агентаў сусьветнага імпэрыялізму, патрабуе ад Вярхоўнага суда жорсткага пакараньня меншавіцкіх шкоднікаў.

У адказ на падрыхтоўку інтэрвэнцыі меншавіцкай арміі, агульны сход пастанаўляе палажыць усе сілы на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, пасьлае 130 лепшых трактарыстаў у камсамол і замацоўвае сябе да канца пяцігодкі.

* * *

Агульны сход працаўнікоў Наркамась веты канстатуе, што, будучы выкінуты за межы СССР, шкоднікі-меншавікі сталі адкрытымі агентамі міжнароднай буржуазіі і ў цесным супрацоўніцтве з ёю рыхтавалі інтэрвэнцыю супроць першай пралетарскай дзяржавы. Агульны сход патрабуе ад суда самых рашучых мер у адносінах да контр-рэвалюцыйных шкоднікаў, якія паставілі сабе мэтай рэстаўрацыю капіталізму ў СССР.

На контр-рэвалюцыйную шкодніцкую дзейнасьць меншавікоў працаўнікі Наркамасьветы адказваюць яшчэ большым згуртаваньнем сваіх радоў вакол камуністычнай партыі, мабілізацыяй усіх сіл на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, на завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

* * *

Агульны сход рабочых і служачых Жлобінскага чыгуначнага вузла у адказ на контр-рэвалюцыйную інтэрвэнцыйную дзейнасьць меншавікоў-шкоднікаў абавязваецца давесьці ўдарніцтва на чыгуначным вузле да 100 проц. і пастанаўляе распачаць з 3 сакавіка месячнік шчэрку па ліквідацыі нашых на транспарце прарываў.

Агульны сход рабочых патрабуе ад Вярхоўнага суда вышэйшай меры пакараньня для агентаў капіталу.

Апрача таго рэзалюцыі пратэсту атрыманы яшчэ ад рабочых швэйнай фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», ў Віцебску, ад магілёўскага гаркамітэту саюзу мэдсанпрацы, ад агульнага сходу супрацоўнікаў Наркамснабу, ад мітынгу рабочых Асінторфу, ад агульнага сходу студэнтаў рэспубліканскай школы прафруху, ад агульнага сходу прафсаюзу Старобішчыны, ад рабочых фабрыкі «Рабочы», ад рабочых мясакамбінату гор. Воршы, ад беларускага аддзяленьня Саюзэкспорт, ад агульнага сходу работнікаў Белтэрфу, ад агульнага сходу рабочых і служачых віцебскага фанэрнага заводу, ад агульнага сходу гарбарні «Чырвоны гарбар», ад рабочых фабрыкі гнутай мэблі, ад пленуму фінансавай сэкцыі віцебскага гарсавету, ад рабочых гомельскай шчацінной фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» і ад асьветнікаў гор. Менску.

Вялікае ў Менску

Сёньня 9-III а 12 г дня ў памяшканьні рэд. „Зьвязды"

склікаецца

НАРАДА БРЫГАДЗІРАЎ

газэт „ЗЬВЯЗДА" і „ПРАВДА",

працаваўшых у раёнах па падрыхтоўцы да веснавой пасэўкампаніі

На нараду абавязаны з'явіцца наступныя т. т. Воінаў, Фрэдзін, Гарбароў, Фарбераў, Каюйко, Фрыд Цыля, Цімафеєнка, Марчук, Радзюн, Адзінец, Саўко, Нехоеў, Філанові і Кантаровіч. Акрамя гэтага на нараду запрошаны прадстаўнікі НКЗ, Белсэльгасцэнтру, Белсельгосту, Трактарабудаўу, і іншыя.

Рэдакцыя «ЗЬВЯЗДЫ»
Маўрэдакцыя «ПРАВДА».

Поўны пераход на спараную язду, барацьба за здаровы паравоз, за эканомію апалу— РУЙНУЮЧЫ УДАР ПА ПЛЯНАХ МЕНШАВІКОЎ-ШКОДНІКАЎ

Адозва ЦК і СНК павінна стаць баявым сьцягам барацьбы за хутчэйшае аздараўленьне транспарту

Па апартуністычнай недаацэнцы да рэканструкцыі транспарту ўдарыць са ўсёй бальшавіцкай непрымірымасьцю

Панончылі з абязьлічкай

Менскія чыгуначнікі капчаткова закончылі з абязьлічкай. Зараз да кожнага паравоза прымацаваны на 2 брыгады. Спачатку паасобныя машыністы не хацелі перайсьці на спараную язду—імкнуліся зьняць з сябе поўную адказнасьць за паравоз.

Першымі выступілі машыністы **Шпілеўскі** і **Таруля**, якія разам са сваімі памочнікамі прыцілі паравоз і на працягу двух выходных дзён рамонтавалі яго.

Калі паравозы былі прывезены ў належны парадак, **Шпілеўскі** заявіў:

— Зараз я галавой нясу адказнасьць за паравоз...

Прыкладу **Шпілеўскага** пасьледавала камсамольская брыгада **Досіна** і **Макаліна**. А ў хуткім часе каля 70 брыгад прыступілі да рамонту і ўсебаковай праверкі спраўнасьці прымацаваных паравозаў.

Быў абвешчан штурм па рамонце паравозаў. Адпрацавалі 1.489 гадзін.

**

Арганізацыі чыгункі рэарганізаваны згодна пастановы партыі і ўраду, але яшчэ не навучыліся па-сапраўднаму кіраваць. Прафсхкамітэты яшчэ ня здолелі стаць на чале энтузіязму чыгуначнікаў.

Такое становішча прывяло да таго, што процант няспраўных паравозаў не зьмяншаецца, а, наадварот, **павялічваецца**. Напрыклад, у студзені няспраўных паравозаў было 8 проц., у лютым—14, а на 1 сакавіка процант няспраўных паравозаў дасягнуў 19.

Партыйныя ячэйкі не рэагуюць на дрэннае кіраўніцтва паасобнымі адміністратамі работай брыгад.

Не наладжана выхаваўчая работа сярод рабочых, якія нядаўна прышлі з вёскі на чыгунку. Сярод гэтых рабочых ёсьць значныя прагулы: за студзень на дэпо было 18 прагулаў, а на малым рамонце—32 чалавека-дні.

Улік прагулаў пастаўлен вельмі дрэнна. Да сёняшняга дня чыгуначныя арганізацыі ня ведаюць, колькі прагулаў было ў лютым месяцы.

Ня вешаюць адміністратары і аб тым, як выконваюцца вымяральнікі працягу цягнікоў. Гэтыя весткі ёсьць **толькі за студзень** месяц, якія гавораць аб тым, што на чыгунцы ня ўсё яшчэ зроблена.

На працягу пасажырскіх цягнікоў ёсьць недавыкананьне вымяральнікаў на 768 клм. і на таварных—на 902 клм. Не вядзецца пікагла ўліку апалу. Арганізацыі вымагаць гэта тым, што ўлік вядзе раённая арганізацыя ў Горшы.

**

Бываюць выпадкі, калі брыгады, прыехаўшы з дарогі, адпачываюць законны час, а склады парожніх вагонаў прастойваюць на 20 гадзін пекарыстанымі. Гэта становішча выклікае неабходнасьць распрацаваць пытаньне аб утварэньні запасных паравозных брыгад на вузлавых станцыях. Калі гэтыя брыгады будуць створаны, можна будзе максымальна скарыстаць паравозы і паражняк.

Да гэтага часу на Менскім вузле **не арганізаваны цягніковыя «трыкутнікі»**. Іх трэба арганізаваць і ўскладзці на іх адказнасьць за цягнік у руху, адказнасьць за спазьненьне цягнікоў, за поўнае выкананьне трасфікацыі.

А. М-ў.

Асіпавіцкі вузел працуе горш

Ударная брыгада насьценгазэты «СЫГНАЛ» праверыла, як ажыцьцёўлена пастанова ЦК і СНК на АСІПАВІЦКІМ ВУЗЬЛЕ. Пастанова была прапрацавана на сходах парт'ячэек, рабочых і служачых. У выніку колькасьць ударнікаў выраслa на 68 чал. 12 ПАРАВОЗНЫХ БРЫГАД УЗЯЛІ ШЭФСТВА НАД НЯСПРАЎНЫМІ ПАРАВОЗАМІ І Ў ЧАСЕ СВАЙГО АДПАЧЫНКУ РАМАНТУЮЦЬ СВАЕ ПАРАВОЗЫ.

Рэарганізацыя на вузле яшчэ ня скончана, але ў рабоце вузла ўжо адчуваецца больш выразнасьці.

Аднак, да сёняшняга дня вузел ня мае вытворчых заданьняў і працуе, паводле вымяральнікаў, якія ён выпрацаваў сам, але якія не зацьверджаны раёнам. За студзень паравозныя брыгады значна недавыканалі свайго заданьня (прабег на адну брыгаду складае 1.726 клм. замест 2.390). Манэўраныя брыгады перавыканалі заданьні (956 клм. замест 920). Невыкананьне заданьня паравознымі брыгадамі тлумачыцца выключна несваячасовым адпраўленьнем цягнікоў. Такім чынам, у студзені маем павялічэньне спазьненьняў цягнікоў, хоць у справе падачы паравозаў ёсьць некаторае паляпшэньне.

Спараная язда праведзена толькі часткова. З ліку замацаваных за Асіпавіцкім дэпо 12 паравозаў, 7 аказаліся няспраўнымі. Таму частка паравозных брыгад засталася не прымацаванай да паравозаў. Праўда, можна было-б прымацаваць паравозныя брыгады да няспраўных паравозаў і даць ім магчымасьць прыняць удзел у рамонце, але да гэтага адміністрацыя не дадумалася.

Брыгада: **Маскаленка, Казлоўскі, Лузанаў, Барбарыч, Пэпічанскі.**

Поўнасьцю выканаць партыйную дырэктыву

(Гутарка са старшынёй бел. бюро ЦК чыгуначнікаў тав. БЕРЗІНГАМ)

Дырэктывай НКПС на дарогах МЬБ чыг. і Заходняй тэрмін пераходу на спараную язду вызначан 5-та сакавіка. Паводле афіцыяльных зестак, якія апрымізаюцца з месц, дырэктыва гэта выканана і спараная язда праведзена на ўсіх вузлах.

Аднак, з раду месц атрымліваюцца сыгналы аб зрыве пераходу (Полацак, Асіповічы, Жлобін, Горша, Віцебск), аб фармальных адносінах да гэтага важнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыемства. На радзе вузлоў наглядзецца апартуністычная недаацэнка пераводу на спараную язду. Фармальна праведзенае прымацаваньне брыгад да паравозаў парушаецца. У **Магілеве** брыгада прывяла ў поўны парадак атрыманы паравоз, пасьля чаго была адміністрацыяй перакінута на другі паравоз. Такія факты наглядаюцца і па іншых вузлах.

Трэба адзначыць, што прымацаваньне да паравозаў выкінала вялікі ўздым сярод паравозных брыгад. Брыгады разгортваць вялікую барацьбу за здаровы паравоз. На толькі сочаць за якасьцю рамонту ў дэпо, але і самі дапамагаюць у правядзеньні яго.

У **Віцебску**, дзе асабліва дрэнна стаіць справа з якасьцю рамонту (у пістадзе было 96 выпадкаў паўторнага рамонту, а ў студзені г. г. — 330), паравозныя брыгады, бачачы, што сьлесары не спраўляюцца з якаснымі патрабаваньнямі рамонту, **абвясьцілі штурм ліквідацыі прарыву па рамонце** і ў вольны ад работы час рамантавалі паравозы ў дэпо.

На **Аршанскім** вузле толькі за адну пяцідзёўку ў лютым м-цы паравозныя брыгады адпрацавалі ў свае выхадныя дні 1.077 гадзін на рамонце паравозаў.

У **Гомелі** кожны дзень працуюць у дэпо 3-4 паравозныя брыгады.

Побач з такім уздымам, які наглядзецца сярод паравозных брыгад, зусім у невыстарчальнай меры разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва паміж **рабочымі рамонту**. Прафарганізацыі ня здолелі мабілізаваць рабочых дэпо на барацьбу за якасьць рамонту.

У адносінах эканоміі апалу канкрэтных вынікаў яшчэ вельмі мала. Праўда, зрух ёсьць: у **Гомелі** пасьля прапрацоўкі адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР 47 чалавек, абвясьціўшы сябе ударнікамі, узялі на сябе абавязак зьнізіць на 15 проц. расход апалу супроць вызначаных норм. У **Гомелі і Жлобіне** праходзіць нераабсталяваньне топак паравозаў скляненьнямі Кірэева, дасягнута рэгулярная прабіўка дымагарных труб, скарыстоўваюцца адходы з дымавых каробак і кавалкі незгаранага коксу на манэўравых паравозах. У **Гомелі** вылучана брыгада з трох інжынэрна-тэхнічных работнікаў, якая займаецца пытаньнем эканоміі апалу.

Ня гледзячы на ўсё гэта, канкрэтнай эканоміі па памянёных вузлох няма. Замест гэтага перапал супроць нормы дасягае ў Гомелі 20 проц. і па Віцебску — 25 проц.

Дрэнна працуюць «энэрга-ячэйкі на вузлох. У **Гомелі** распушчана энэрга-ячэйка за непрацаздольнасьць, а ў **Віцебску і ў Воршы** такія ячэйкі нават не арганізаваны, ня гледзячы на дырэктывы ЦК і бел. бюро чыгуначнікаў.

Сярод мерапрыемстваў, якія павінны спрыяць эканоміі апалу, трэба адзначыць вельмі каштоўныя прапановы, якія ўнесены на нарадзе далегатаў Усесаюзнага з'езду саветаў—чыгуначнікаў, якую праводзіла белбюро ЦК чыгуначнікаў: склікаць вытворчыя нарады качагараў, вугольшчыкаў і ўсіх тых рабочых, якія маюць дачыненьне да апалу, праводзіць аб'яднаныя нарады машыністаў, дзяжурных па дэпо, дзяжурных па станцыі і дыспэчэраў па пытаньні аб эканоміі апалу. Асабліва вялікая роля ў эканоміі апалу належыць дыспэчэру, бо калі качагар можа з'эканоміць лапату апалу, дык дыспэчэр—тэндэры, калі будзе своячасова паведамляць дакладны час падрыхтоўкі паравозаў пад чарговыя цягнікі.

Трэба адзначыць, што ўсе недахопы, якія пералічаны вышэй, зьяўляюцца вынікам нерашучай перабудовы чыгуначных прафарганізацый, невыстарчальнага разгортваньня сацыяборніцтва, слабой масавай работы сярод чыгуначнікаў, апартуністычнага самацёку. Чым іншым, як ня горшым відам правага апартунізму, зьяўляецца той факт, што **па Віцебску** за адзін месяц лік ударнікаў павялічыўся... на 2 чалавекі. Пры такой «мабілізацыі» мае паўрад ці справяцца прафсаюзныя арганізацыі з адказьнейшымі задачамі, якія на іх ускладаюцца.

Для масавай праверкі фактычнага пераходу на спараную язду, барацьбы за здаровы паравоз і эканоміі апалу белбюро ЦК чыгуначнікаў паслала па ўсе вузлы брыгаду. Гэта брыгада пры дапамозе шырокіх колаў ударнікаў выкрые ўсе перашкоды і канкрэтных вінаватых у марудным перабудове работы, дапаможа хутчэйшаму павароту прафсаюзу да транспартнай гаспадаркі, рэалізацыі важнейшага палітычнага дакумэнту партыі і ўраду аб сац. рэканструкцыі транспарту.

Калінкавіцкія бюракраты

Брыгада КК-РСІ зрабіла праверку выкананьня пастановы ЦК і СНК аб чыгуначным транспарце на **ст. Калінкавічы**. Праверка выявіла, што ячэйка КП(б)В і мясцком своячасова паставілі гэта пытаньне на партсходах і агульных сходах рабочых і служачых. Пытаньне таксама абмяркоўвалася на цэхах. Аднак, нынікаў ад прапрацоўкі пастановы няма.

Колькі з'эканомлена апалу — невядома, бо гэта ўлічваецца кіраўніцтвам чыгункі. Аднак, наколькі сыстэма выдаткаваньня апалу ня зьмешана, можна меркаваць, што перавыдаткаваньне вугалю, што мела месца за лістапад—сьнежань, робіцца і цяпер. Фонд для прэміраваньня за эканомію апалу по скарыстоўваецца.

Гомельскае раённае кіраўніцтва часта прысылае неспраўныя паравозы ў Калінкавічы і забірае спраўныя. У выніку ў Калінкавіцкім дэпо знаходзіцца 7 паравозаў, а іх з для манэўраў у той час, калі на гэтай станцыі і адзін паравоз справіцца з манэўрамі.

На спараную язду чыгунка перайшла толькі за апошнія дні, пасьля катэгарычнай тэлеграмы з цэнтру. Калінкавіцкія бюракраты лічаць пераход на спараную язду нямэтазгодным з тэй прычыны, што станцыя невялікая і ня мае такога руху, які, быццам, павінен быць пры сыстэме спаранай язды.

Падрыхтоўка падраў, г. зн. работа фабзавуча праходзіць у кепскіх умовах. Няма памяшканьня для інтэрнату. Памяшканьне для заняткаў таксама кепскае і ня мае абсталяваньня. Некаторыя посьпехі ёсьць у справе падрыхтоўкі памочнікаў машыністаў, качагараў, стрэлачнікаў—з ліку батракоў, беднякоў і калгасьнікаў бліжэйшых вёсак.

Брыгада: **Залесін, Кінбароўскі, Белацаркоўскі.**

З паравоза на паравоз

Пераход на спараную язду на **Жлобінскім раёне** ў асноўным скончаны. Але паасобныя адміністратары недаацэньваюць значэньня поўнага выкананьня дырэктывы ўраду і няправільным падборам паравозных брыгад, перакідваньнем іх з паравозу на паравоз падрываюць асноўныя мерапрыемствы па аздараўленьні паравознай гаспадаркі.

Так, машыніст дэпо ст. Жлобін тав. **Чарнецкі А.** перакідваўся з паравоза на паравоз **тры разы**, знаходзячыся па кожным 3-4 дні. У малышыста **Руцэвіча** ў Асіповічах забралі яго паравоз, далі яму другі і толькі ў Жлобіне праз некалькі дзён аддалі назад. Такая-ж гісторыя здарылася з машыністам **Казловым**. У яго адабралі паравоз, які пасьля гэтага прайшоў каля 1.000 клм., згубіў запасныя рэзэрвуары, тармазы Вэстынгауза, качагарны інструмант і г. д. У такім выглядзе паравоз быў вернуты ў дэпо ст. Жлобін.

Брыгада — **Байкачоў і Пракаповіч — была прымацавана да паравоза № 6726**, зрабіла на ім адпаведны парадак, тры разы праехалася, пасьля чаго гэты паравоз у яе адабралі і далі другі.

Усе гэтыя факты кажуць аб тым, што некаторыя гаспадарнікі не зразумелі як належыць дырэктыву ЦК і СНК аб чыгуначным транспарце. Гэтыя факты былі абмеркаваны на шырокай вытворчай нарадзе паравозных брыгад. Вырашана не дапускаць перакідваньня брыгад, а ў выпадку адабраньня паравоза ад брыгады фіксаваць гэта, як здарэньне, і віноватых прыцягваць да судовай адказнасьці.

З іншых недахопаў работы Жлобінскага раёну трэба адзначыць наступныя. Раёну не хапае кваліфікаванай рабочай сілы. Замест 210 чыгуначнікаў вярнулася на транспарт толькі 78 чал. Яшчэ большы недахват адчуваецца раёну ў інжынэрна-тэхнічных сілах.

Працдысцыпліна крыху палепшылася але выпадкі нядбайных адносін да выкананьня сваіх абавязкаў з боку паасобных машыністаў ёсьць і па сёняшні дзень. Лік здарэньняў зьменшыўся з 98 у першай дэкадзе лютага да 78 у другой дэкадзе і 39—у трэцяй дэкадзе.

Перабудова работы прафарганізацыі ў асноўным скончана. Але не наладжана яшчэ работа сэктараў, месцкомаў, слаба ўцягваецца добраахвотніцкі актыў, не арганізаваны «трыкутнікі» ў цягніках, не перабудавана работа самога райпрафсаюзу згодна новай структуры. Ідзе вярбоўка добраахвотнікаў для арганізацыі сэкцый пры райпрафсаюзе.

Усе гэта разам прыводзіць на невыкананьня трансфікацыі. Па некаторых паказальніках за люты ёсьць нават пагоршаньне. Процант няспраўных паравозы усё яшчэ складае 33,5. Своячасова адпраўляюцца толькі 36% цягнікоў. Сярэднясутачны прабег паравозаў складае 100,3 клм. замест 203. Сярэднясутачны прабег вагонаў — 98,2 клм. замест 139 клм. і г. д.

К.

Месячнік рабочага шэфства над апаратам

Шефства—важнейшая масавая работа на прадпрыемстве

«Барацьба з бюракратызмам,—сказаў у свой час тав. Ленін, — патрабуе дзесяцігодзьдзяў». Гэта цяжэйшая барацьба і ўсякі, хто будзе гаварыць вам, што мы вызваліміся адразу ад бюракратызму, калі мы прымем антыбюракратычныя пляцформы, будзе проста шарлятанам...»

XVI партыйная канферэнцыя ў сваёй пастанове на дакладзе тав. Якаўлева паставіла тры асноўныя задачы ў галіне палепшэньня дзяржаўнага апарату і барацьбы з бюракратызмам:

1. Праверка выкананьня становіцца самай важнай часткай усёй работы па палепшэньні дзяржаўнага апарату. «Правяраць людзей і правяраць фактычнае выкананьне справы — у гэтым, яшчэ раз у гэтым, толькі ў гэтым крэвоздь—усёй работы, усёй палітыкі» (Ленін). XVI партз'езд падкрэсьліў, што гэта паказаньне Ўладзімера Ільліча зараз на новым этапе набывае асаблівае значэньне і становіцца цэнтральнай задачай усёй барацьбы з бюракратызмам.

2. Палепшэньне асабістага складу і чыстка савецкага апарату ад элементаў, якія разлажылися, скажаюць савецкі закон, змыкаюцца з нэпманам і кулаком, ад шкодніка, хабарніка, растратчыка, бюракратаў і гультаёў. XVI з'езд на аснове вынікаў першага году чыстки савецкага апарату даручыў ЦКК-РСІ працягнуць чыстку падалей, пашырыць яе на ўвесь адміністрацыйна-савецкі, гаспадарчы і кааперацыйны апарат, падкрэсьліўшы, што «чыстка—справа ня толькі РСІ, але ўсёй партыі, усёй рабочай клясы.

Перабудова сыстэмы кіраўніцтва, адпаведна патрабаваньням рэканструкцыйнага пэрыяду, на падставе ўкараненьня навукова-рацыяналізатарскіх мэтадаў ва ўсе галіны вытворчасьці, пляніраваньня і кіраўніцтва.

Партыя мае вялікія посьпехі ў ажыцьцяўленьні гэтых асноўных паказаньняў XVI партканфэрэнцыі.

Тав. Сталін на XVI з'езьдзе УсеКП(б) рашуча падкрэсьліў, што «каб разьбіць бюракратызм у нашых установах і арганізацыях, зьнішчыць бюракратычныя норавы і звычаі», трэба «расчысьціць дарогу для разгортваньня творчай ініцыятывы і самадзейнасьці мас. Гэту задачу трэба вырашыць ва што-б там ні стала, калі мы хочам сапраўды перабудаваць нашу краіну на пачатках сацыялізму».

Палітычнае значэньне рабочага шэфства над дзяржапаратам

Рашаючыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, як вынік правільнасьці генэральнай лініі партыі, выклікалі бурны рост палітычнай актыўнасьці рабочае клясы і стварылі ўсе ўмовы для арганізацыі масавага рабочага кантролю зьнізу над дзяржапаратам і ажыцьцяўленьня пакаяньняў Леніна, каб «усе выконвалі функцыі кантролю і нагляду, каб усе на час станавіліся «бюракратамі», каб таму ніхто ня змог стаць бюракратам».

У часе чыстки савецкага апарату, рабочыя ўзяліся за настойлівае вывучэньне сыстэмы і мэтаду работы апарату. У нетрах маскоўскага электразаводу, брыгады якога чысьцілі Наркамфін—нарадзілася ідэя рабочага шэфства над савецкім апаратам, ажыцьцяўленьня сталага масавага рабочага кантролю зьнізу над дзяржапаратам. Гэта ідэя дала магчымасьць прыцягнуць шырокія рабочыя масы да праверкі выкананьня і, такім чынам, да «навучаньня новых пластоў рабочых і сялян справе кіраўніцтва, каб праверка выкананьня ўсё ў большай меры станавілася мэтадам палепшэньня савецкага апарату» (з пастановы XVI партканфэрэнцыі).

У сваёй пастанове ад 15-га сакавіка 1930 году па пытаньні аб вылучэньні рабочых у савецкі апарат і масавым рабочым кантролі ЦК і ЦКК УсеКП(б) адзначылі «вялікае значэньне шэфства—масавага рабочага кантролю зьнізу, які вырас на аснове павышэньня палітычнай актыўнасьці рабочай клясы, гаспадарчага ўздыму краіны і наступленьня на капіталістычныя элементы; шэфства зьяўляецца адной з лепшых форм удзелу рабочых, якія застаюцца на вытворчасьці, у кіраўніцтве дзяржавай».

Перад заводамі-шэфамі былі пастаўлены наступныя задачы:

— Выпучаць рабочых брыгады для актыўнага ўдзелу ў чыстцы савецкага апарату.

— Выпучыць актыўных перадавых рабочых - удзельнікаў чысткі ўстановы для сталай работы ў апошняй.

— Прымацаваць па скончэньні чысткі рад рабочых брыгад да паасобных важнейшых зьвеньняў падшэфнага апарату для сталай праверкі і нагляду за іх работай.

Шэфскія брыгады павінны сыстэматычна дакладваць аб выніках сваёй работы на заводзкіх сходах, на пасяджэньнях Калегіі НК-РСІ. Кіраўнікі ўстаноў павінны рабіць справаздачы аб рабоце апарату на сходах рабочых заводаў-шэфаў.

ЦК і ЦКК у сваёй пастанове падкрэсьлілі, што «партыйныя камітэты і ячэйкі заводаў абавязаны ўсялякі падтрымліваць шэфства, разглядаючы яго, як важнейшую частку масавай работы на прадпрыемстве». Асноўная задача шэфства—штодзённы кантроль з боку заводаў-шэфаў над выкананьнем падшэфным апаратам усіх важнейшых дырэктыў партыі і ўраду.

Усе арганізацыі павінны дапамагчы і падтрымаць правядзеньне шэфства над апаратам.

Становішча рабочага шэфства ў БССР

Па ўсёй БССР, у сувязі з чысткай савецкага апарату, прынялі шэфства над савецкімі ўстановамі 44 прадпрыемствы, але трэба адзначыць, што шэфства, якое шырока разгарнулася ў часе чыстки, пасьля апошняй замерла наадвор'е. Ня ўсе важнейшыя прадпрыемствы, як Менск, Віцебск, Гомель, У Барысаве, Ворны, Бабруйску і Магілеве рабочае шэфства ня выйшла за межы габінэтаў і пляначаў. Прэзыдыум ЦСПСБ ацаніў адносіны многіх прафарганізацый да рабочага шэфства, як грубую палітычную недаацэнку гэтага мерапрыемства, як праяўленьне правага апартунізму на практыцы і паставіў рашучае пытаньне аб тым, каб у бліжэйшы час дабіцца ў гэтай галіне карэннага пералому. **На працягу сакавіка** праводзіцца месячнік праверкі і палепшэньня шэфскай работы.

Задачы месячніка

— Зрабіць пералом у рабочым шэфстве, шырока папулярызаваць палітычнае значэньне рабочага шэфства над дзяржапаратам, пашырыць шэфства на ўсе вучасткі савецкага, гаспадарчага і кааперацыйнага апарату, праверыць выкананьне пастаноў камісіі па чыстцы, дапамагчы апарату ўзяць бадзёрыя тэмпы, на аснове сацыяборніцтва, ударніцтва і выразнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, — галоўныя задачы месячніка.

На працягу месячніка трэба дабіцца, каб кожны рабочы добра зразумеў палітычны сэнс і практычныя шляхі ажыцьцяўленьня шэфства. Прадпрыемствы-шэфы павінны заслухаць справаздачы падшэфных устаноў і складаць шэфскіх брыгад, праверыць склад брыгад з пункту погляду працаздольнасьці і аўтарытэтнасьці брыгадзіраў, палепшыць падбор апошніх, разгрузіўшы іх ад розных грамадзкіх абавязкаў. Трэба вылучыць на ўсіх прадпрыемствах пастаянныя шэфскія камісіі ў складзе члена бюро парткалектыву, члена фабзаўкому і прад стаўніка камсамолу для кіраўніцтва шэфскай работай.

На працягу месячніка трэба арганізаваць сацыяборніцтва і ўдарніцтва ў падшэфных установах.

Згодна праграмы ЦКК-РСІ, рабочыя брыгады, якія прымалі ўдзел у чыстцы, правяраюць, як выкананы пастановы камісіі па чыстцы.

Вакол месячніка павінна быць мабілізавана ўвага цэнтральнага, раённага і нізавога друку і шырокіх рабкораўскіх мас.

Партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі павінны з усёй адказнасьцю і ўважлівасьцю адносіцца да пытаньняў шэфства, як да важнейшай часткі масавай работы на прадпрыемстве, памятаючы, што недаацэнка шэфства, што няўважлівыя адносіны да яго аб'ектыўна дапамагаюць бюракратам, апартуністам і шкоднікам укрывацца ў падшэфным апараце, тармазіць тэмпы пераможнага сацыялістычнага наступленьня.

ГЕРШМАН.

Сацыял-шкоднікі

На лаве падсудных перад пралетарскім судом сядзяць прадстаўнікі «саюзнага бюро» РСДРП (меншавікоў)—агентура II Інтэрнацыяналу ў СССР. Нам ужо вядома з абвінавачэньня, якія задачы «саюзнае бюро» ставіла перад сабой і якімі ідэямі яно натхнялася. Мы таксама ведаем з абвінавачэньня, што «бюро» было законным дзіцем замежнага рускага меншавізму, ад яго атрымлівала дырэктывы і падтрымлівала з ім сувязь праз вядомага меншавіка Абрамовіча. Пралетарскі суд выкрыў усю дзейнасьць меншавізму, яго сувязь са шкоднікамі і інтэрвэнтамі супроць СССР.

На лаве падсудных сядзяць меншавікі, бундаўцы, эсэсаўцы. Бунд, СС, ПЦ і інш. ніколі нельга было адмежаваць ад рускага меншавізму. Яны жывіліся сокамі адных і тых-жа карэньняў, сумесна змагаліся супроць пралетарскай рэвалюцыі і ў гады Кастрычніка паставілі сябе на службу барацьбы супроць Саветаў, вядучы контр-рэвалюцыйную работу.

Не дарма тайну на лаве падсудных сядзяць меншавікі разам з бундаўцамі і эсэсаўцамі, не дарма тайну сунімаюць тэрміны замоцненай падрыхтоўкі да інтэрвэнцыі з тэй датай, калі польскі Бунд — асколак быў «адзінага прадстаўніка яўрэйскіх рабочых у Расіі, Польшчы і Літве», уступіў у II Інтэрнацыянал. Гэтым афіцыяльна і арганізацыйна была замацавана за польскім Бундам — сацыял-фашысцкай агентурай Пілсудчыны — належнае месца сярод «маркісыстаў» II Інтэрнацыяналу.

Бунд—пажаданы госьць

Калі на чытаньне бундаўскую «Найе Фолкс Цайтунг» і меншавіцкі «Социалистический Вестник», вам кідаецца ў вочы адзінства стылю і мэтаімкнёнасьці гэтых органаў меншавізму і бундызму. Як «Соцвестник» гукнецца, так і «Фолкс Цайтунг» адгукнецца. Калі «Соцвестник» узьняў свой голас за «гуманізм» і «чалавечасьць» супроць бальшавіцкіх «барбараў» з мэтай абароны Рамзіных і іншых шкоднікаў, «Найе Фолкс Цайтунг» неадкладна выступае на сваіх шпальтах з тэй-жа песенькай, даказваючы, што шкоднікі зусім—ня шкоднікі, а «сацыялісты», што Суханавы зьяўляюцца адданымі работнікамі савецкай сыстэмы і г. д, і г. д. Калі «Соцвестник» разгортвае кампанію супроць «савецкага дэмпінгу» і «савецкага рабства», «Фолкс Цайтунг» неадкладна пераводзіць гэту кампанію на яўрэйскую мову, дадаючы сюды необходную дозу спэцыфічнага матар'ялу для чытача Налеўкі. Зразумела таму, што «Соцвестник» ня мае нічога супроць кіраўніцтва польскага Бунду і яго органу—«Найе Фолкс Цайтунг».

«Соцвестник» так доўга загульваў з Бундам, Бунд так доўга яёў перагалоры з II Інтэрнацыяналам, Абрамовіч так доўга падтрымліваў сувязь паміж меншавізмам і бундызмам да таго часу, калі наступіў належны момант і Бунд афіцыяльна ўступіў у II Інтэрнацыянал. Гэтаму «важнаму моманту» — уступленьню Бунду ў II Інтэрнацыянал — «Соцвестник» прысьвячае спэцыяльны артыкул пад назвай «Да ўступленьня Бунду ў РСІ». У гэтым артыкуле гаворыцца: «Пастанова бундаўскага з'езду (аб уступленьні яго ў II Інтэрнацыянал —Х. Д.) знамянуе сабою апошні этап у вызваленьні партыі яўрэйскіх рабочых ад бальшавіцкіх забабонаў... Для нашай партыі (г. зн. для меншавікоў—Х. Д.)... будзе вялікім здавальненьнем сустрэць у РСІ ў якасьці палпрэчыкаў і саюзьнікаў людзей, з якімі нас зьвязваюць і традыцыі сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы і шматгадовае партыйнае сяброўства» («Соцвестник», № 11 1930 г.). Што належыць «сумеснай барацьбы» меншавікоў з бундаўцамі, аўтар артыкулу ў «Соцвестнике» зусім мае рацыю — іншы-ж бундаўцы ўвесь час разам з меншавікамі і ў пэрыяд эканамізму, і ў пэрыяд ліквідатарства, і ў сваёй эрэдыцкай рабоце ў адносінах да пралетарскай рэвалюцыі. Гэтага адмаўляць нельга. І таму лёгка пралетарыць сабе, чаму асколкі меншавізму, выкінутыя за борт Савецкага Саюзу, якія акапаліся ў «Соцвестнике» і жывуць за кошт II Інтэрнацыяналу, падбадзёрыліся ад таго, што іх армія павялічылася за кошт польскага Бунду. Што-ж належыць першай часткі цытаты, дык тут аўтар артыкулу ў «Соцвестнике» зрабіў падлог — справа звычайная для меншавіцкіх пер'яў. Гэта-ж няправільна, што Бунд вызваліўся ад «бальшавіцкіх забабонаў». Гэта зусім непрадуманадобна, гэта проста паклёп. **Бунд нікопі не недамагаў «бальшэвіцкімі забабонамі».** «Бальшавіцкія забабоны» былі ў рабочых мас, якія супрацьціўляліся сваім «правадырам» в Бунду. Рабочыя, уваходзячы ў Бунд, і зараз стаяць у апазыцыі да бундаўскай лініі і тактыкі. Не дарма-ж «Соцвестник» прыпамінае аб тым, што на назначэньні зьезьдзе, дзе Бунд прыняў сваю пастанову аб уступленьні ў II Інтэрнацыянал, амаль палова далегатаў галасавала супроць бундаўскай пастановы. Мы схільны думаць, што тут мець яўлеў іменна тая апазыцыйная сіла рабочых, якія заражаны «бальшавіцкімі забабонамі». Але як гэта можа прыйсьці думка абвінаваціць Бунд, партыю Бунду, у «бальшавіцкіх забабонах».

Сьцяг Бунду ужо афіцыяльна ўнесен у II Інтэрнацыянал, і Бунд стаў афіцыяльным членам сацыял-фашысцкай сям'і, афіцыяльным удзельнікам адзінага фронту інтэрвэнтаў-шкоднікаў — заядлых прыхільнікаў вайны з Савецкім Саюзам, заядлых праціўнікаў сацыялізму і пралетарскай дыктатуры.

На бундаўцаў усклаўдаліся вялікія надзеі

«Соцвестник» не здавальняецца сваёй бундаўскай гвардыяй у фашысцкай Польшчы. Польскі Бунд не зьяўляецца адзіным сацыял-шкоднікам. «Соцвестник» усклаўдае надзеі таксама на бундаўскія асколкі ў... СССР. «... Праз замежную дэлегацыю РСДРП і II Інтэрнацыяналу фармальна прадстаўлен і Бунд у савецкай Расіі. Але гэта нелегальная... слабая арганізацыя... яўрэйскага СД руху нямінуча павінна была сканцэнтраваць усю сваю энэргію на самаахову і на вырашэньне праблем, зьвязаных з разьвіцьцём бальшавізму ў Расіі». («Соцвестник», № 10, 1930 г., артыкул Р. Абрамовіча) Так піша сам Абрамовіч. Зараз нам зусім зразумела, чаму Абрамовіч шукаў сувязі са старымі цэнтрамі бундаўскага руху, — ён шукаў ніці да «слабой арганізацыі яўрэйскага СД руху», г. зн. да бундаўцаў і нацыяналістаў у СССР, бо Бунд узяў на сябе місію, як аб гэтым заяўляе Абрамовіч, «вырашэньня праблем, зьвязаных з разьвіцьцём, бальшавізму ў Расіі». Тут Абрамовіч нам адкрыта гаворыць, што бундаўцы ў Расіі мелі антысавецкія задачы. Гэта заява зараз цацьвярджаецца тым фактам, што на лаве падсудных разам з меншавікімі сядзяць прадстаўнікі Бунду і СС («аб'яднаных»).

Зараз ужо ясна роля Бунду — роля партыі Бунду як у Польшчы, так і роля бундаўцаў у СССР. На бундаўцаў на гэты раз была ўскладзена агульнапартыйная, а ня вузка-нацыянальная задача: ні больш, ні менш, як паладраць бальшавізм. Спадзяваліся па тое, што яны гэта змогуць выканаць. Але... гэтым марам ня суджана ажыцьцявіцца.

„Соцвестник" і... яўрэйскія клерыкалы

Момант быў яручны: калі рымскі папа ўзьняў антысавецкую кампанію, «Соцвестник» паставіў сваёй задачай «растлумачыць» сваім чытачом галенькае Саветаў на рэлігію і такім чынам растлумачыць важнае значэньне клерыкальнага фронту супроць Саветаў. Пры гэтым «Соцвестник» не забыў сказаць пару добрых слоў звычайнага кадэтаа па адрасе яўрэйскіх рабінаў. У сваім артыкуле «Барацьба з рэлігіяй» («Соцвестник» № 5, 1930 г.) вядомы меншавік Д. Далін піша: «Ну, вось-жа менскія рабіны пацвісалі дакумант, які ні у чым на ўступае красамоўнасьці праваслаўных іерархаў». Аказваецца, што «адзіная ўлада, якая праводзіць мерапрыемствы, якія даюць магчымасьць прыгнечанаму і бясправнаму да рэвалюцыі народу наладзіць сваё жыцьцё больш бясьпечна,—гэта савецкая ўлада». «Гэта чуецьць—заяўляе Далін—злой насьмешкай пры сотках дзевяці дзесятых рускіх яўрэяў аб безгранічным зруйнаваньні і зьбяднеьні... З яўрэйскіх сельска-гаспадарчых калёній прыходзяць самыя трагічныя весткі...».

Такім чынам, Далін вопытнай рукой адразу забіў двох зайцаў. З аднаго боку, ён ўсхваляў рэлігію, мякка вылаяўшыся пры гэтым па адрасе «пявытрыманых» менскіх рабінаў, якія «зьнемагаючы пад ботам бальшавіцкай дыктататуры», заяўляюць, што яўрэі жывуць бясьпечна ў СССР. З другога боку, ён «праінфармаваў» чытачоў «Соцвестника» аб ганеньнях на «яўрэйскі народ» у СССР, аб «загібелі дзевяці дзесятых яўрэяў», аб «зруйнаваньні яўрэйскіх мас», аб «трагічных енках яўрэйскіх калёністаў». А мы, наіўныя людзі, сядзім у СССР і нічога ня ведаем аб тым, што робіцца вакол нас. Аказваецца, што зусім ня ісьце тысяч яўрэйскіх рабочых на фабрыках, што няма шэкага калгаснага будаўніцтва вакол мястачак і ў Крыму і Біра-Біджане, што ня ісьце самрамкаалэрацыі, што яўрэйская дэклясаваная беднота зусім не устройваецца, наадварот: дзевяць дзесятых яўрэйскага насельніцтва «безгранічна зруйнаваны». Аб гэтым ведае Далін, а мы гэта зусім выпусьцілі з-пад увагі...

Адвакаты яўрэйскіх рабінаў і яўрэйскага кулака, які ліквідуецца ў яўрэйскіх калёніях як кляса на базе суцэльнай калектывізацыі, сказалі таксама сваё слова ў «яўрэйскім пытаньні» так, як гэта належала ад іх чакаць. Нічога другога Далін ня мог сказаць. Гэтым ён прышоў на дапамогу бундаўцам унутры СССР.

Як-жа належыць назваць такую пастаноўку: сацыяльная ці «нацыянальная» контр-рэвалюцыя. Правільна будзе, калі мы скажам наступнае: і тое і другое — мы маем перад сабой меншавізм памножаны на шавінізм і клерыкалізм.

Меншавізм—Кауцкі—сіяніізм...

II Інтэрнацыянал часта займаецца сіяністычн

Другой бальшавіцкай вясьне—бальшавіцкае спатканьне

РАУНЕНЬНЕ на КАЛГАС „КАМБАЙН“,

які папулярызацыяй тэзісаў т. Якаўлева сярод аднаасобнікаў арганізуе новы калгасны прыліў

Адкажам халопам францускага імпэрыялізму і „Торгпрома“—Рамзіным, Шэрам, Громанам, Суханавым, Кандрацьцевым і іх беларускім субратом—контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратам 100-процантнай кантрактацыяй яравых пасеваў, магутным уздымам сталінскага прызыву ў калгасы, баявой падрыхтоўкай да веснавой сяўбы

Зруйнаваць сабатаж правых апартуністаў, якія прабуюць затармазіць пераможны калгасны рух і сарваць падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны. Нанесьці сьмяротны ўдар кулацтву

Арцель „Камбайн“

АРГАНІЗУЕ СТАЛІНСКІ ПРЫЗЫЎ У КАЛГАСЫ

Падрыхтоўка да сяўбы—на рэйках бальшавіцкіх тэмпаў

СЛУЦАК. (Наш кар.).

Калгас **«Камбайн»**, Слуцкага раёну, ключыўся ў сталінскі прызыў. Калгас першым у раёне **выканаў** пастанову раённага зьезду калгасаў аб падваеньні колькасьці сваіх членаў. За апошнюю дэкаду ў «Камбайн» уступіла 32 бяднацка-серадняцкія гаспадаркі. Калгас разгарнуў актыўную работу сярод аднаасобнікаў вёскі Шалхцяны, паставіўшы сабе мэтай ахапіць яе поўнасьцю на шлях калектывізацыі. На сёньняшні дзень **гэта вёска калектывізавана на 65%**. **«Камбайн»** арганізаваў ударныя брыгады калгасьнікаў па вярбоўцы аднаасобнікаў у калгасы.

Зараз калгас «Камбайн» разгарнуў ударную падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі. Увесь с.-г. інвэнтар і машыны адрамантаваны і поўнасьцю падрыхтаваны да выхаду ў поле. Скончана ачыстка і засыпка пасеньня.

У адказ інтэрвэнтам

ВЫСАЧАНЬЕ. (Па тэлеграфу).

У АДКАЗ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ МЕНШАВІКОЎ, ЯКАЯ ПРАБАВАЛА НА ЗАГАДЗЕ П-САЦЫЯЛ-РАШЫСЦКАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ АГНЕМ І МЯЧОМ ІНТЭРВЭНЦЫІ САРВАЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў НАШАЙ КРАІНЕ, У РАЁНЕ РАСЬЦЕ СТАЛІНСКІ ПРЫЗЫЎ У КАЛГАСЫ.

ЗА МІНУЛЫЯ 6 ДЗЁН ПРЫЗЫВУ АРГАНІЗАВАНА 5 НОВЫХ КАЛГАСАЎ. У КАЛГАСЫ ЎСТУПІЛА 112 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. ПРОЦАНТ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ПА АСОБНЫХ СЕЛЬСАВЕТАХ КРУТА ЎЗЫНЯЎСЯ ЎВЕРХ. КАРАЛЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ УЖО КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫ НА 52%. ПАСТУПЛЮЦЬ НОВЫЯ ЗАЯВЫ АДНААСОБНІКАЎ АБ ПРЫЕМЕ Ў КАЛГАСЫ.

ВІГДАРОВІЧ.

5 новых калгасаў

ПЯТРЫКОЎ. (Наш кар.).

У РАЁНЕ НАРАСТАЕ ХВАЛЯ СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ Ў КАЛГАСЫ. ПЕРШЫ АДКРЫЦЬЦІ РАЁННАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСАЎ АРГАНІЗАВАНА 5 НОВЫХ С.-Г. АРЦЕЛЯЎ. У КАЛГАСЫ ЎСТУПІЛА 75 АДНААСОБНЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

ДЭЛЕГАТЫ ЗЬЕЗДУ, УСЕ ЯК АДЗІН, АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМІ НА ПАДРЫХТОЎКУ СЯЎБЫ І АРГАНІЗАЦЫЮ СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ Ў КАЛГАСЫ.

З пастановы НКЗ БССР

Калегія НКЗ БССР, заслухаўшы даклад аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой с.-г. кампаніі і калектывізацыі, адзначыла, што процант калектывізацыі на 1 сакавіка па Лепельскім, Круглянскім, Багомльскім, Плешчаніцкім, Лагойскім, Койданаўскім, Крычаўскім, Клімавіцкім, Жыткавіцкім, Хойніцкім, Брагінскім і Кармянскім раёнах перавышае 30.

Адначасова калегія канстатавала, што раёны **Гомельскі, Рэчыцкі, Бабруйскі, Гарадоцкі, Бешанковіцкі, Дубровенскі, Можанскі, Віцебскі**, як і раней, знаходзяцца на самым апошнім месцы ў справе калектывізацыі бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. Ахоп па гэтых раёнах калектывізацыяй бяднацка-серадняцкіх гаспадарак не дасягае 10 проц.

Раёны **Багушэўскі, Сіроцінскі, Боркавіцкі, Гарадоцкі, Суражскі, Вушацкі, Чашніцкі, Хоцімскі, Касьцюковіцкі, Клічаўскі, Чырвонаслабодзкі, Глускі, Чэчэрскі, Быхаўскі, Рэчыцкі, Веткаўскі, Чэрыкаўскі, Тураўскі, Брагінскі, Лоеўскі і Магілеўскі** ня выканалі дырэктыў ЦК партыі аб давядзеньні плянаў да калгасаў і бяднацка-серадняцкіх гаспадарак у парадку самаабавязацельстваў і ў параўнаньні з другімі заданьнямі да кулацка-заможнай часткі вёскі.

Мабілізацыя страхавых фондаў па **Копыскім, Коханаўскім, Талачынскім, Кармянскім, Любаньскім, Сьвіслацкім, Асіповіцкім, Вузьдзенскім, Старадарожскім, Слуцкім, Старобінскім, Глускім, Жлобінскім, Рагачоўскім, Расьнянскім, Чачэрскім, Веткаўскім, Уваравіцкім, Рэчыцкім, Мазырскім, Аршанскім, Карасінскім, Хойніцкім, Кармянскім, Цераховскім, Віцебскім, Магілеўскім і Бабруйскім** раёнах не пастаўлена ў цэнтр увагі работы раённых арганізацый, у выніку чаго плян засыпкі пасеўных фондаў выкананы ня больш чым на 10 проц.

За апошнюю мер да своечасовай і правільнай інфармацыі Наркамзему, а таксама за неправядзеньне мерапрыемстваў па давядзеньні плянаў і мабілізацыі пасеўных і страхавых фондаў у раёнах, калегія Наркамзему пастанавіла **зьняць з работы загадчыкаў Рэчыцкага, Церахаўскага, Веткаўскага, Глускага раёнаў і прасіць РВК прыцягнуць іх судовай адказнасьці за бязьдзейнасьць і зрыў мерапрыемстваў уряду.**

Абвешчана вымова загадчыкам **Багушэўскага, Боркавіцкага, Сіроцінскага, Гарадоцкага, Суражскага, Вушацкага, Чашніцкага, Хоцімскага, Касьцюковіцкага, Клімавіцкага, Чырвонаслабодзкага, Чачэрскага, Быхаўскага, Мазырскага, Буда-Кашалёўскага, Брагінскага, Лоеўскага і Магілеўскага** раёнаў.

Наркамзем папярэдзіў усіх загадчыкаў земаддзелаў, што пяўжыцьцё мер з боку да перадому ў справе калектывізацыі ня давядзеньне плянаў засеву да калгасаў, бяднацка-серадняцкіх гаспадарак і мабілізацыі пасеўных і страхавых фондаў будзе разглядацца як бязьдзейнасьць і зрыў мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да веснавой с.-г. кампаніі і калектывізацыі з выцягваньнямі адпаведных выводаў.

Арганізацыйна-інструктарскаму сэктару разам з Калгасцэнтрам даручана працяцу двухдэкаднага тэрміну абсьледаваць работу **Гомельскага, Рэчыцкага, Гарадоцкага, Бешанковіцкага, Можанскага і Віцебскага** раёнаў з мэтай выявіць прычыны слабой работы па калектывізацыі бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Адозва калгасу „Камбайн“ да Ўсесаюзнага зьезду саветаў

СЛУЦАК. (Наш кар.).

Пастаўленыя на абмеркаваньне агульнага сходу членаў калгасу «Камбайн» разам з аднаасобнікамі (Старынскі сельсавет) тэзісы дакладу тав. Якаўлева Усесаюзнаму зьезду саветаў выклікалі вялікую зацікаўленасьць і шмат водгукаў з боку прысутных. З асаблівым здавальненьнем сход сустрэў 3 разьдзел тэзісаў. Калгасьнікі ў сваіх выступленьнях заяўлялі што ва ўмовах разгорнутага сацыялістычнага наступленьня стаяць у баку НЕЛЬГА. На аснове вопыту калгасу «Камбайн» выступаўшыя адзначалі, што прынцыпы разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасе па колькасьці і якасьці затрачанай працы, а таксама прынцыпы арганізацыі працы на аснове зьдзельшчыны зьяўляюцца ПРАВІЛЬНЫМІ.

Калгасьнікі выказалі ўпэўненасьць, што пад кіраўніцтвам партыі калектывізацыя ў асноўным будзе скончана да канца пяцігодкі. Адзначалася, што на сёньнешні дзень калгас «Камбайн» аднаў ужо 70 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. Правільная пастаноўка работы і разьмеркаваньне прыбыткаў забясьпечыла непарыўны прыпіў новых членаў у гэты калгас.

Пасьля абмеркаваньня тэзісаў 12 ПРЫСУТНЫХ АДНААСОБНІКАЎ БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў КАЛГАС «КАМБАЙН», гэтым самым падкрэсьліўшы сваё далучэньне да тэзісаў тав. Якаўлева. Рэшта прысутных аднаасобнікаў заявіла, што яны зараз ужо канчаткова вырашылі свае адносіны да калгасу і ў бліжэйшыя дні ўступяць у рады актыўных барацьбітоў за калгаснае будаўніцтва.

Агульны сход прыняў наступную адозву да VI усесаюзнага зьезду саветаў:

«Агульны сход членаў калгасу «Камбайн» разам з вакольнымі аднаасобнікамі—беднякамі і серадняками, заслухаўшы і абмеркаваўшы тэзісы т. Якаўлева, ДАЛУЧАЕЦЦА ДА ІХ ЦАЛКАМ І ПОЎНАСЬЦЮ. Сход са здавальненьнем адзначае, што тэзісы зусім правільна адлюстроўваюць сапраўднае становішча калгаснага будаўніцтва, яго дадатнія і адмоўныя бакі, правільна вырашаюць пытаньні далейшага будаўніцтва калгасаў.

З асаблівым здавальненьнем сход адзначае правільную ленінскую пастаноўку пытаньня аб зьменах у расстаноўцы клясавых сіл у вёсцы ва ўмовах разгорнутага наступленьня на капіталістычныя элементы. Калі кулацтва ліквідуецца як кляса на аснове суцэльнай калектывізацыі, — стаяць у баку нельга. Можна быць або разам з калгасьнікамі і ўсёй рабочай клясай, або супроць — у саюзе з кулаком.

Вопыт калгасаў показвае, што працоўны прынцып разьмеркаваньня прыбыткаў і арганізацыя працы на аснове зьдзельшчыны зьяўляецца правільнай асновай для пасьляховага разгортваньня калектывізацыі.

Сход выказвае сваю ўпэўненасьць, што пад правільным кіраўніцтвам камуністычнай партыі калгасны рух будзе разгортвацца яшчэ больш шпаркімі тэмпамі і да канца пяцігодкі справа калектывізацыі будзе ў асноўным закончана.

Сход запэўняе ЦК УсеКП(б) і VI усесаюзны зьезд саветаў, што калгас «Камбайн» на аснове дасягнутых посьпехаў вырашыць пытаньне суцэльнай калектывізацыі сваёй вёскі Клянчаны ўвесну гэтага году.

Няхай жыве кампартыя і яе правадыр тав. СТАЛІН!

Няхай жыве VI усесаюзны зьезд саветаў!»

Кантрактуем

ЯРАВЫЯ ЗАСЕВЫ НА 100 ПРОЦ.

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Контр-рэвалюцыйная дзейнасьць «саюзнага бюро» ЦК РСДРП(м), рыхтуючага ў цесным саюзе з «прампартыяй» і кулацка-эсэраўскай «ТКП» крывавую інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу, выклікала магутную хвалю абурэньня сярод калгасьнікаў і аднаасобных бяднацка-серадняцкіх мас Магілеўшчыны.

У адказ інтэрвэнтам рад калгасаў раёну па-бальшавіцку ўзьняў тэмпы падрыхтоўкі да другой калгаснай вясны. Калгас **«Чырвоная зорка»** Вялікабілевіцкага сельсавету ў асноўным ужо выканаў усе заданьні па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Поўнасьцю ссыпан і ачышчан насенны фонд. Сабраны страхавы фонд і забраніяваны фураж. Увесь с.-г. інвэнтар адрамантаваны. Абмеркаваўшы адозву СНК і ЦК аб кантрактацыі, калгас аднадушна пастанавіў **закантрактаваць усе свае яравыя засевы на 100 проц.**

Калгас **«Энэргія»**, Рафалаўскага сельсавету, разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва, дабіўся істотнага пералому ў падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі. Асноўныя заданьні па падрыхтоўцы да сяўбы ўжо выкананы. Поўнасьцю ссыпан страхавы і насенны фонды. Машыны і с.-г. інвэнтар прыведзены ў баявую гатоўнасьць. Калгасьнікі с. г. арцелі **«Парыская камуна»** пастанавілі цалкам і поўнасьцю закантрактаваць свае яравыя засевы. Калгас канчае падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Ачыстка і ссыпка пасеннага і страхавога фондаў закончана. Амаль усе машыны і с.-г. інвэнтар адрамантаваны.

Калгасы Вендароскага сельсавету рыхтуюцца да пробнага выезду ў поле, які вызначан на 15 сакавіка. Калгасы імя **Калініна** і **«Чырвоны партызан»** гэтага-ж сельсавету закончылі рамонт с.-г. інвэнтару, ачысьцілі і ссыпалі насенны матар'ял і забраніявалі фуражныя фонды.

Аднаасобнікі пасёлкаў Задруцьце, Чырвоная горка і інш. (Гарадзішчанскі сельсавет) у адказ контр-рэвалюцыйнай арганізацыі меншавікоў **закантрактавалі свае яравыя засевы** і выклікалі пасьледваць іх прыкладу іншыя вёскі сельсавету.

Расьце сталінскі прызыў у калгасы. У в. Севасьцьянавічы, Дабраневіцкага сельсавету, арганізован новы калгас **«Шлях камунізму»**. На другім раённым калгасным зьезьдзе паданы рад заяў аднаасобнікаў аб прыёме іх у калгасы.

У сьвятле гэтых фактаў **злачынная зьяўляецца праваапартуністычная дзейнасьць раённага калгассаюзу, які зусім ня кіруе падрыхтоўкай да веснавой пасеўнай кампаніі.** На віне райкалгассаюзу, да сёньняшняга дня многія калгасы ў раёне яшчэ ня маюць плянаў пасеўнай кампаніі, што зрывае падрыхтоўку да сяўбы. З-за абураючай неахайнасьці райкалгассаюзу ў некаторых калгасах яшчэ не закончана зямляўпарадкаваньне.

Апартуністы, зрываючыя падрыхтоўку да сяўбы, павінны напесьці самае суровае пакараньне.

Апартуністы зрываюць падрыхтоўку да сяўбы

ГЛУСК. (Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ» і «ПРАВДЫ»).

Брыгада «Зьвязды» і «Праўды» праверыла ход падрыхтоўкі Карпілаўскага сельсавету і паасобных калгасаў і саўгасаў раёну да веснавой пасеўнай кампаніі.

Праверка паказала, што падрыхтоўка праходзіць з рук вон дрэнна. У сельсавеце панує праваапартуністычная стаўка на самацёк. Ні сельсавет, ні партыйная і камсамольская ячэйкі нічога не зрабілі, каб забясьпечыць баявое разгортваньне падрыхтоўкі да другой калгаснай вясны. Для адводу вачэй Карпілаўскі сельсавет выклікаў на спаборніцтва Парыцкі сельсавет, але гэты выклік застаўся на паперы. Практычна нічога ня зроблена.

Да сёньняшняга дня пасеўныя тэрміны НЕ ДАВЕДЗЕНЫ да калгасаў, вёсак і паасобных гаспадарак. Ачыстка і ссыпка пасеўнага матар'ялу па сельсавеце злачынна зрываецца. На складах КСУ насеньне ляжыць не ачышчаным. Праўда, у сельсавеце працуе абоз, але ён за месяц 120 тон ачысьціў толькі адну тону. Рамонт не разгарнуты. Кузьня, якая ёсьць у сельсавеце, не працуе.

Калектывізацыя праходзіць самацёкам. Работнікі сельсавету і партыйныя ячэйкі адкрыта прызнаюцца, што імі «ў гэтай галіне нічога ня зроблена». Нядзіва, што ў сельсавеце амаль няма ніякага прыпіву ў калгасы. За апошні час не арганізавана ні аднаго калгасу. У тры існуючыя калгасы ўступіла ўсяго толькі... тры гаспадаркі.

Прычына такіх ганебных тэмпаў калектывізацыі заключаецца ў ЗЛАЧЫННАЙ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ РАЙКАЛГАССАЮЗУ, СЕЛЬСАВЕТУ І МЯСЦОВАЙ ПАРТЫЙНАЙ ЯЧЭЙКІ.

У калгасах сельсавету падрыхтоўка да сяўбы таксама зусім не разгорнута. У калгасе імя 1-га мая авёс і жыта не абмалочана. Інвэнтар не адрамантаваны. Усё яшчэ нават ня складзен плян веснавой пасеўнай кампаніі. Кармавы фонд разбазараны.

Больш-менш здавальняюча рыхтуецца да сяўбы саўгас Рудабелка, аднак, і ён патрэбных баявых тэмпаў ня ўзяў.

Праваапартуністычнае кіраўніцтва Карпілаўскага сельсавету і партыйныя ячэйкі, правяючыя важнейшыя дырэктывы партыі і ўраду, павінны быць неадкладна зьняты з работы і прыцягнуты да строгай адказнасьці.

„Згубілі“ 8 калгасаў

ЛЕПЕЛЬ. (Брыгада «Зьвязды»).

Паасобныя сельсаветы Лепельскага раёну дабіліся бясспрэчных посьпехаў у падрыхтоўцы да другой калгаснай вясны. У Прудонскім сельсавеце, напрыклад, пасеўныя пляны поўнасьцю даведзены да калгасаў і аднаасобных гаспадарак. Плян ільназагатовак у асноўным выкананы. Сельсавет абвясьціў сябе ўдарным па правядзеньні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній. У Насенінскім сельсавеце пасеўныя пляны таксама даведзены да калгасаў і аднаасобных гаспадарак. На агульных сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў шырока прапрацавана адозва СНК і ЦК аб кантрактацыі.

Па-баявому рыхтуецца да веснавой сяўбы калгас «Батрак», Каменскага сельсавету. Калгас стварыў насенны, страхавы і фуражны фонды. Рамонт інвэнтару і с.-г. машын скончан. Вылучана брыгада з 10-ці лепшых калгасьнікаў для дапамогі новым калгасам у правядзеньні веснавой сяўбы. «Батрак» сабраў звыш 10 тон попелу для ўгнаеньня.

Раённая газэта «Калгасная праўда» арганізавала пры кожным сельсавеце і калгасе пасты для праверкі падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі. Раённая МТС абвясьціла сябе ўдарнай па правядзеньні веснавой сяўбы і ўжо цалкам і поўнасьцю закончыла дагаворную кампанію.

Але гэтыя паасобныя факты ні ў якой меры не кампэнсуюць тых вялізарных прарываў у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, якія ёсьць на сёньня ў Лепельскім раёне. Кіруючыя раённыя арганізацыі ўсё яшчэ яўна ігнаруюць задачу своечасовай падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі. Адсутнічае настойлівы ўлік і давядзіцца кантроль, ніто не дае ніякай магчымасьці ўстанавіць сапраўдны малюнак падрыхтоўкі да сяўбы на раёне.

Прафсаюзныя арганізацыі раёну да гэтага часу яшчэ ня прымаюць літаральна ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы да сяўбы. Бязьдзейнічае і камсамол. Ня дзіва, што ў цэлым засыпка пасенных фондаў і страхавых фондаў у раёне праходзіць зусім нездавальняюча. Абмен гатунковага насеньня як у калгасах, так і на аднаасобных гаспадарках, не арганізаван.

У калгасным будаўніцтве Лепельскі раён дасягнуў відавочных посьпехаў. На 1 сакавіка ў калгасах знаходзіцца 3.478 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак — 43 проц. усіх гаспадарак раёну. Некаторыя сельсаветы (напрыклад, Каменскі) калектывізаваны больш чым на 65 проц.

Аднак, гэтыя посьпехі на замаўкваюцца. Раённыя арганізацыі аддаюць зусім невыстарчальную ўвагу арганізацыйнаму ўмацаваньню калгасаў. У раёне, напрыклад, 8 калгасаў («Новы шлях», «Чырвоны ўсход», «Маяк», «Чырвоная перамога», «Яскравы прамень», імя Дзяржынскага, «Заболіна» і «Калгасная праўда») да гэтага часу не зарэгістраваны ні ў райсаюзе, ні ў райкалгассаюзе. Між тым, некаторыя з гэтых калгасаў існуюць ужо больш году. Для свайго апраўданьня работнікі райсаюза маюць цэлую кучу бязглуздых «аб'ектыўных» прычын. Так, напрыклад, яны заяўляюць, што... «няма статутаў». Між тым, у раёне валяецца без усякай карысьці цэлая груда гэтых статутаў. Адсутнасьць патрэбнага кіраўніцтва з боку райкалгассаюзу і сельсаветаў прывяло да развалу двух калгасаў у раёне. Ганебнейшы факт. Трэба неадкладна спыніць гэту праваапартуністычную практыку.

Расьце

СТАЛІНСКІ ПРЫЗЫЎ У КАЛГАСЫ

ДУБРОЎНА. (Наш кар.).

ЗА АПОШНЮЮ ДЭКАДУ ЛЮТАГА Ў РАЁНЕ АРГАНІЗАВАНА 13 НОВЫХ КАЛГАСАЎ. У КАЛГАСЫ ЎСТУПІЛА 189 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

МНОГІЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ ГРУПЫ Ў РАЁНЕ ПРАВОДЗЯЦЬ СВАЁ АГАРМ ЕНЬНЕ Ў КАЛГАСЫ. ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ СТВОРАНЫ БРЫГАДЫ СА СТАРЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ

„Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё“ (Сталін)

Рацыяналізацыя—неадлучная частка паходу за тэхніку

Недаацэнка рабочых прапаноў, рабочай ініцыятывы і здагадкі—найгоршы від апартунізму на практыцы

Максымальным разьвіцьцём рацыяналізатарскага руху параліжуем шкодніцтва

У змаганьні за мэханізацыю

На Менскай шчотачнай фабрыцы большасьць працэсаў робіцца ўручную. Калі фабрыка перайшла ў веданьне Наркамгандлю, рабочыя разам з адміністрацыяй зьвярнуліся да яго з просьбай дапамагчы пераабсталяваць фабрыку, бо далей працаваць у такіх умовах вельмі цяжка. Наркамгандлю «дапамог» тым, што паслаў усе пастановы ў Белпячаціну. Але і Белпячаціна не зьвярнула ўвагі на становішча фабрыкі.

На адным са сходаў дырэктар фабрыкі—былы рабочы **тав. Любін** сказаў:

— Калі мы самі ня возьмемся за работу, ніхто нам не дапаможа. Кожны рабочы павінен сам падумаць аб паляпшэньні свайго вучастку. Давайце прапановы па рацыяналізацыі.

На другі дзень пры ўваходзе на фабрыку на двох слупох была прыбіта вялікая дошка, якая адалёк крычала рабочым: **«Падумай і запішы, як замяніць ручную працу машынай».** Рабочыя ніць ручную працу машынай». Рабочыя падыходзілі да дошкі і запісвалі на ёй свае прапановы.

Рабочы **Дзінштэйн** вынайшаў машыну для ўшыўкі дроту ў шчоткі. Машына з'эканоміць 6.500 руб. у год. Вынаходзтва вельмі каштоўнае і тав. Дзінштэйн атрымаў прэмію ў 500 руб.

Рабочы **Каплан** арабіў шаблёнуючыя лінейкі з каласным цэху, што дае эканоміі 2.500 руб. у год.

Рабочы **Несьвіскі** ўнёс прапанову часаць волас на сушні. Гадавая эканамія 4.800 руб. Тав. **Оксенкруг** вынайшаў машыну для часаньня воласу. Эканомія 9.000 руб.

Раней пяць работніц сядзелі і абразалі ножніцамі верхнія фанэрныя крыш кі на шчотках. Работніцы калечылі рукі і пераходзілі на ўтрыманьне страхакасы. Тав. Міклашэўскі вынайшаў машыну для абрэзкі крышак. Зараз работніцы ня будуць калечыць рук, а эканоміі будзе 1.500 руб.

Такіх прапаноў рабочыя ўнесьлі шмат. З гэтых прапаноў складзен рацыяналізатарскі плян на 1931 год, які дае **98 тыс. руб. эканоміі.** Студзенскі плян рацыяналізацыі выкананы на 71,6 проц. Застрэльшчыкам рацыяналізацыі быў **шліфавальны цэх.** Там было арганізавана першае цэхавае рацыяналізатарскае бюро. Шліфоўшчыцы абвясьцілі сябе ўдарніцамі па складаньні рацыляну і выклікалі па сацспаборніцтва іншыя цэхі. У хуткім часе рацбюро былі арганізаваны па ўсіх цэхах.

Арганізавана агульна-фабрычнае бюро рацыяналізацыі. загадчыкам якога незначаны былы рахункавод тав. Сукасаў, які сам вучыўся і вучыў другіх. Рацыяналізатарскі актыў складае каля 100 рабочых і работніц.

12 выпаходнаў арганізавалі бюро рабочага вынаходзтва. Работа яго цесна ўвязана з работай бюро рацыяналізацыі.

Выпаходцы пасылаюцца ў палуковыя ўстановы, дзе разглядаюцца іх выпаходніцтве. Па ўсіх цэхах распрацаваны рацыяналізатарскія тэмпікі. Арганізаваны курсы па падрыхтоўцы адміністратараў і рацыяналізатараў. На курсы запісалася шмат рабочых і работніц, з іх адабралі 22 лепшых ударнікаў. Курсы працуюць рэгулярна і плянава.

На жаль, ні Наркамгандлю ні Белпячаціна ня цікавяцца работай фабрыкі Многа раз адміністрацыя фабрыкі ставіла пытаньне аб пабудове сушні, пазіма дзе высушыць патрэбную кольскасьць матар'ялаў. Але кіруючыя арганізацыі маўчаць.

А. Свабодны.

Фармалістаў—пад агонь рабочай крытыкі

Адна з асноўных задач, якія стаяць перад кіраўніцтвам кожнага прадпрыемства, гэта—арганізаваць працаздольнае бюро рацыяналізацыі. Гэта асноўная дырэктыва, як паказаў месячнік рацыяналізацыі, на шмат прадпрыемствах ня выканана, або выканана фармальна.

Так, на **Віцебскай панчошнай фабрыцы** загад аб стварэньні бюро рацыяналізацыі быў адданы ў студзені бягучага году, прычым бюро складзена з такіх працаўнікоў, якія і без таго вельмі нагружаны.

У Тэнстыльаб'яднаньні бюро рацыяналізацыі існуе фактычна на паперы. Апрача рабочага-вылучэнца ў бюро ўваходзіць інжынэр-рацыяналізатар, на якога ўскладзена кіраваньне плянавым аддзелам.

Рацыяналізацыя да гэтага часу ня стала масавай работай. Грамадзкія арганізацыі, якія павінны дапамагаць у гэтай справе, стаяць у баку. У выніку няма актыву, а групы садзейнасьці пры цэхах або зусім адсутнічаюць (**панчошная фабрыка**), або працуюць без кіраўніцтва і дапамогі і таму ніякай карысьці да гэтага часу ня прынесьлі (**акуцярная фабрыка**).

Гаспадарнікі звычайна апраўдваюцца аб'ектыўнымі прычынамі—няма на кого ўскласьці гэтых абавязкаў. А што яны рабілі для атрыманьня рацыяналізатараў? Чаго варты адносіны кіраўнікоў панчошнай фабрыкі, якія нават не скарысталі магчымасьцяй паслаць здольнага работніка на курсы рацыяналізатараў. Няўжо-ж сярод 2-х тысяч рабочых не знайшлося каго паслаць?

У свой час, пасьля першай праверкі становішча рацыяналізацыі і барацьбы са стратамі (у верасьні 1930 г.) прозьдымы ЦСПСБ і ВСНГБ далі рад канкрэтных указаньняў для паляпшэньня гэтай работы. Пастанова ЦСПСБ і ВСНГ павінна была быць даведзена да кожнага рабочага і стаць «памяткай» для ўсіх кіраўнікоў прадпрыемстваў і рацыяналізатараў. Між тым, як выявіў месячнік рацыяналізацыі, пастанова **ЦСПСБ і ВСНГ некаторым гаспадарнікам прафсаюзнікам нават не знаёма.**

Адначасова трэба адзначыць, што работы ў галіне рацыяналізацыі—непачаты край. На Віцебскай акуляраай фабрыцы цэлыя скуры рэжуцца рукамі на вузкія палоскі. Тут можна было-б правесьці два мерапрыемствы: першае—мэханізаваць рэзку, другое— перадаць гэту работу Віцебскаму скурзаводу і прапанаваць яму вырэзваць гэтыя палоскі ня з цэлых скур, а з абрэзкаў і алкіладу, а цэлыя скуры перадаваць абутковым фабрыкам.

Другі прыклад. Гомельская абутковая фабрыка часта атрымлівае такія скуры, з якіх трэба рукамі зьмяцаць мяздру. А ці нельга гэта рабіць на гарбарні, дзе ёсьць спэцыяльнае абсталяваньне і дае можна было-б гэтыя скуры прасляць на дзьве-тры часткі, як гэта робіцца на Менскай гарбарні плянцівачнай машынай?

Такое-жа становішча з штампоўкай падмётак, якія не адпавядаюць лекалам і якія на абутковай фабрыцы прыходзіцца абразаць. У выніку—лішняя праца і рост сабекошту.

На акулярнай фабрыцы красёваньне попелу праводзіцца ўручную, прычым рабочым выконваць тую работу надзвычайна цяжка. І гэта ў той час калі ёсьць прапанова замяніць ручную работу на мэханічную сеялку. Гэта прапанова марынуецца амаль 8 месяцаў і толькі зараз праводзіцца ў жыцьцё.

Такое становішча назіраецца амаль ва ўсіх галінах рацыяналізатарскай работы. Мае месца фармальны падыход, значнае спазьненьне з выкананьнем рабочых прапаноў. Такія фармальныя і бюракратычныя адносіны толькі душаць энтузіязм рабочых.

Адміністрацыйнае, партыйнае і прафсаюзнае кіраўніцтва прадпрыемствамі павінны неадкладна пераключыць сваю работу на сапраўдную рацыяналізацыю. А гэта будзе зроблена толькі тады, калі рабочая мася возьме ўсю рацыяналізатарскую працу пад жорсткі кантроль і ўсіх фармалістаў паставіць пад агонь рабочай крытыкі.

А. Біргер.

НЯ ХОЧУЦЬ РАССТАВАЦЦА З ПРАДЗЕДАЎСКАЙ ТЭХНІКАЙ

Гомельскі лесазавод **«Калектыўная праца»** зьяўляецца досыць буйным прадпрыемствам, але працуе яшчэ прымітыўнымі, прадзедаўскімі мэтадамі.

Да рацыяналізацыі вытворчасьці з боку лесаб'яднаньня і заводакіраўніцтва наглядаецца **апартуністычныя адносіны.**

Рабочыя высунулі шмат рацыяналізатарскіх прапаноў, ухваленых рацыяналізатарам і адміністрацыяй. Гэтыя прапановы павінны даць каля **65.000 руб. эканоміі.** Але прапановы пакуль што засталіся на паперы. Чаму? Аб прычынах скажа наступны факт: на ўказаньне рабочага, што адсутнасьць саматасу для падачы калод прымушае траціць шмат сродкаў на вясковыя фурманкі, а гэта зараз справа ня лёгкая, дырэктар заводу адказаў:

—Боты, кажухі і авёс грошы нам не каштуюць, бо сяляне за гэта плацяць...

Такім чынам, па думцы дырэктара, выходзіць, што пабудаваць саматас ня выгодна.

Надобныя-ж прычыны адміністрацыя знаходзіць для апраўданьня невыкананьня іншых рацыяналізатарскіх прапаноў.

Ня спыняцца на паўдарозе

Брыгада, вылучаная для праверкі рацыяналізацыі на МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫЦЫ, выявіла наступнае. Адносіны з боку кіраўніка фабрыкі да рацыяналізацыі добрыя. Але тэхнічны пэрсанал, у тым ліку загадчыкі цэхамі, ня толькі ня цікавяцца гэтай справай, але часам адносяцца да яе бюракратычна.

На фабрыцы няма падрыхтаваных рацыяналізатараў. А калі Скураб'яднаньне прадаставіла фабрыцы адно месца на рацыяналізатарскіх курсах у Кіеве, чамусьці не знайшлося кандыдата на гэта месца.

Тэхнічны пэрсанал на пытаньне—чаму яны ня ўносяць рацыяналізатарскіх прапаноў, адказваў—«будзем уносіць тады, калі пройдзем у новы корпус». Такія адказы былі нават і ў той час, калі рабочыя ўносілі дзесяткі рацыяналізатарскіх прапаноў.

Апрача агульна-заводзкага аддзелу рацыяналізацыі, на фабрыцы было і цэхавае бюро. Бюро ў свой час працавала добра, але знайшліся людзі, якія пара[illegible] тав. Сакураву рацыяналізаваць» і рацыяналізатара вылучылі рэдактарам шматтыражкі. А бюро рацыяналізацыі засталося без карыснага працаўніка.

Адна вельмі каштоўная прапанова—замяніць раскройку скуры ўручную—штампоўкай, якая павінна даць вялікую эканомію, ня можа быць выкананая таму, што Скураб'яднаньне не адпусьціла адпаведнай сумы на набыцьцё штампавачных варштатаў.

Ёсьць на фабрыцы і значныя дасягненьні ў справе рацыяналізацыі. Праверка загрузкі варштатаў дала магчымасьць павялічыць загрузку з 65-70 проц. да 86-96 проц. У апошні час арганізавана выстаўка дасягненьняў па рацыяналізацыі і рабочых прапаноў. Арганізавана таксама вітрына браку. Рад працаўнікоў-камандыруецца ў буйныя гарады, каб пераняць вопыт іншых абутковых фабрык. У кандагавор унесен пункт, які прадугледжвае разгляд рабочых прапаноў на працягу 3-х дзён.

Але гэтыя дасягненьні не пакрываюць тых вялікіх прабелаў у рацыяналізатарскай рабоце, якія ёсьць на фабрыцы.

НЕСЬЦЕРАЎ.

Рацыяналізатарская думка сьпіць

Месячнік рацыяналізацыі выявіў, што на прадпрыемствах МАГІЛЕВА ня створаны ўмовы, якія-б спрыялі разгортваньню рацыяналізатарскай работы. Трыкутнікі прадпрыемстваў маюць на клапоцяцца аб стварэньні моцных рацыяналізатарскіх ячэек і ня сталі на чале ўздыму рабочых мас, якія выяўляюць свае адносіны да рацыяналізацыі вялікай колькасьці прапаноў.

На ФАБРЫЦЫ ШТУЧНАГА ШОЎКУ бюро рац

Прафсаюзы—тварам да вытворчасьці

У БССР АРГАНІЗУЮЦЦА 27 ПРАФСАЮЗАЎ

У ажыцьцяўленьне пастановы V пленуму УсеЦСПС, прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў правесьці разбуйненьне прафсаюзаў БССР на аснове далейшага паглыбленьня вытворчага прынцыпу пабудовы прафсаюзаў. Замест раней шых 19 прафсаюзаў, у БССР арганізуюцца наступныя 27 саюзаў:

Рабочых машынабудаўнічай прамысловасьці; спанцавай і тарфяной прамысловасьці; швэйнікаў; шарсьцяной і шаўковай прамысловасьці; прамысловага, жыльлёвага і камунальнага будаўніцтва; цэмантна-керамічнай прамысловасьці; чыгуначнага, партовага і дарожнага будаўніцтва; мукамольнай, хлебнай і кандытэрскай прамысловасьці; мяса-рыбна-кансэрвнай і маслабойнай прамысловасьці; тытунёвай і брадзільнай прамысловасьці; жывёлагадоўчых саўгасаў; МТС і батракоў; збожжавых саўгасаў; камунальнай гаспадаркі; гарадзкіх прадпрыемстваў і хатніх работніц; грамадзкага харчаваньня; работнікаў аапэрацыі і дзяржгандлю; работнікаў дзяржаўных устаноў; работнікаў банкаўскіх і фінансавых органаў; рабочых несадрэваапрацоўчай прамысловасьці; гарбароў; папярова-паліграфічнай прамысловасьці; мэдсанпрацы; працасьветы; нарсувязі; працмастацтва і чыгуначнікаў.

Прэзыдыум зьвярнуўся з просьбай да УсеЦСПС дазволіць арганізацыю ў БССР **ЦП** саюзаў рабочых **ільнапяньковай і джутавай прамысловасьці, шкляной і фарфоравай прамысловасьці і траспартнікаў.**

Аргінструктарскаму сэктару ЦСПСБ прапанавана ў месячны тэрмін скончыць рэарганізацыю саюзаў і правесьці зьезды разбуйнёных прафсаюзаў.

Прэзыдыум зацьвердзіў наступную структуру **ЦСПСБ:** прэзыдыум, сакратарыят з 5 чал. і сэктары: арганізацыйна-інструктарскі; вытворчасьці і плянаваньня; культработы; масавай работы; кадраў; сацыяльна-бытавы і рабочага забесьпячэньня; фінансавы; статыстычны; бюро фізкультуры і БелМВІТ.

Сярэднія зьвенні прафсаюзаў (раённыя і гарадзкія аддзяленьні) будуць ліквідаваны за выключэньнем саюзаў працасьветы і мэдсанпрацы. Арганізацыя сярэдніх зьвеньняў будзе дапушчана, як выключэньне, з асобнага дазволу прэзыдыуму ЦСПСБ.

У мэтах лепшага забесьпячэньня і дапамогі рабочым важнейшых прадпрыемстваў прамысловасьці звыш прадугледжанага законам аб сапстрахаваньні, прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў арганізаваць спэцыяльныя касы **ўзаемадапамогі** на 5-ці чыгуначных вузлох (Менск, Ворша, Магілеў, Гомель, Жлобін), па заводах: «Чырвоны мэталіст», імя Ланцуцкага, «Пралетары», «Гомсельмаш», «Камунар», імя Варашылава, на акулярнай фабрыцы, гарбарні «Бальшавік» і на фабрыцы «Дзьвіна».

У сувязі з рэарганізацыяй прафсаюзаў і падпарадкаваньнем значнай колькасьці прадпрыемстваў непасрэдна ЦК саюзаў, павінна быць значна ўзмоцнена роля і значэньне, а таксама адказнасьць райпрафсаветаў, як міжсаюзных арганізацый.

Поўнасьцю выканаць пляны мясазагатовак

Самыя жорсткія меры да тых, хто патурае кулаку

Вышэйшыя партыйныя і савецкія арганізацыі далі выразную дырэктыву — выканаць да 1-га красавіка г. г. 70% гадавога пляну мясазагатовак. Да 1-га сакавіка плян загатовак мяса выканан па БССР на 43%.

Такія дрэнныя вынікі сьведчаць аб яўна апартуністычнай недаацэнцы мясазагатовак, аб адсутнасьці адпаведнай работы на мясцох, аб паяўнасьці курсу на самацёк, аб слабым націску на кулака.

Ёсьць раёны, дзе плян мясазагатовак выкапан у зусім нязначай меры.

Так, Быхаўскі раён загатовіў 19,2% гадавога пляну, Журавіцкі — 15,3%, Касьцюковіцкі — 14,4%, Караліндскі —16,8%, Сьмілавіцкі — 14,1%, Хоцімскі — 15,4% і Чачэрскі—15,2%.

Раённыя кіраўнікі дрэнная работай па мясазагатоўках падрываюць рабочае забесьпячэньне, тармозяць выкананьне прамфінпляну, зрываюць выкананьне дырэктыў ураду.

Паводле дырэктыў, цьвёрдымі заданьнямі павінна быць ахоплена 20-25% гадавога пляну мясазагатовак. Гэтыя дырэктывы ганебна парушаны. Ня ўжыты ніякія меры, каб прымусіць кулацкія гаспадаркі здаць мяса, у радзе месц патурацоць кулаком ня выконваць цьвёрдых заданьняў.

У Быхаўскім раёне, напрыклад, ахоплена цьвёрдымі заданьнямі толькі 5% пляну, у Журавіцкім — 9%, у Касьцюковіцкім — 2,4%, у Сьмілавіцкім — 7,3%, у Хоцімскім—5,8%.

Пералічаныя раёны павінны заразжа падцягнуцца і прыняць усе захады, каб навярстаць упушчанае, каб выканаць пляны мясазагатовак.

У адносінах да ўсіх тых, хто патурае кулаку, хто зрывае загатоўкі трэба ўжыць самыя рашучыя, самыя жорсткія мерапрыемствы.

Лепшыя раёны, якія добра праводзяць загатоўкі мяса

ДЗЯКУЮЧЫ ДОБРА ПРАВЕДЗЕНАЙ МАСАВАЙ РАБОЦЕ, ВЯЗЬЛІТАСНАЙ БАРАЦЬБЕ З КУЛАЦКІМ САБАТАЖАМ, 6 РАЁНАЎ ВЫКАНАЛІ ПЛЯНЫ ЗАГАТОВАК МЯСА.

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ ІДЗЕ **ВЕТРЫНСКІ** РАЁН, ЯКІ НА 1-ГА САКАВІКА ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛЯН.

НА ДРУГІМ МЕСЦЫ — АСВЕЙСКІ РАЁН, ЯКІ ЗАГАТОВІЎ 93 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

У ВУЗЬДЗЕНСКІМ РАЁНЕ ЗАГАТОЎЛЕНА 88 ПРОЦ., ВАЛЫНЕЦКІМ — 86 ПРОЦ., ВУЛЬСКІМ — 70 ПРОЦ., ДРЫСЕНСКІМ — 70 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ.

Па Савецкай Беларусі

Гарком саюзу саўгандальслужачых бязьдзейнічае

ГОМЕЛЬ. У практычнай рабоце Гомельскага гарадзкога аддзяленьня саюзу саўгандальслужачых зусім не адлюстраваліся задачы, пастаўленыя партыяй і рабочай клясай на перабудове прафработы тварам да вытворчасьці.

Пасеўная кампанія, мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, прапрацоўка пастаноў пленуму ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб рэарганізацыі каапэрацыйнай сыстэмы прайшлі міма ўсёй саюзнай масы.

Кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам няма — уся работа праходзіць самацёкам.

Калдагаворная кампанія па шмат устаповах яшчэ на скончана, а ў радзе месц нават не распачалася (у гарсавеце, аддзеле працы, страхкасе, судовых установах і інш).

З 15 членаў гарадзкога камітэту саюзу саўгандальслужачых на пасяджэньні зьяўляюцца 4, а то і менш. Пляну работы гарадзкі камітэт не мае. Разваліліся мясцкомы; страхкасы гарсавету, аддзелу працы і судовых устаноў. Рэвізійн. камісія гаркому ні разу ня зьбіралася. Члены гаркому саюзу нават ня ведаюць хто старшыня рэвізійнай камісіі.

Члены гарадзкога камітэту т. т. **Лебедзеў і Ардашнікаў** матывуюць бязьдзейнасьць нізавых прафарганізацый... пасыўнасьцю мас.

«Дзейнасьць» гарадзкога камітэту саюзу саўгандальслужачых нельга інакш кваліфікаваць, як апартунізмам на практыцы.

БЭЙЛІН.

Курсы бяз выкладчыкаў

Белкаапсаюз перакінуў на іншую работу адзінага выкладчыка курсаў рахункаводаў пры Пятрыкоўскім, Капаткевіцкім, Жыткавіцкім і Тураўскім раёнах—тав. Шафрана.

Курсы-ж засталіся зусім бяз выкладчыка і вараз развальваюцца. Белкаапсаюз павінен безадкладна скасаваць сваю пастанову.

ГАЛАВЕЙ.

Нам пішуць

Спажывецкая каапэрацыя працуе па-старынцы

БЯГОМЛЬ. Ніякага вруху ў работе спажывецкай каапэрацыі раёну няма. Паянакпленьне праходзіць самацёкам. Ёсьць выпадкі самазабесьпячэньня з боку работнікаў крам (загадчыцы цэнтральнай крамы **Шыфрын** і інш.).

Па раённай сетцы спажывецкай каапэрацыі **растрачана каля 10 тысяч рублёў—у Мсьціжскай краме** каля 2-х тыс. руб., у Бярэзінскай — 1 тыс. руб. і г. д. У раённай кніжнай краме ляжыць на 1000 руб. літаратуры, у той час, як у вясковых крамах яе амаль няма.

Самакрытыка ў загоне, вытворчых нарад ня бывае, рацыяналізацыя апарату не праводзіцца. У рэзультаце штат спажывецкай каапэрацыі вельмі разбух: у некаторых крамах, якія абслугоўваюць толькі адзін сельсавет, працуюць па 4 работнікі.

ШЫМАНОЎСКІ.

МЕНСК

Усебеларускі зьлёт польскіх калгасаў

У Менску адкрыўся ўсебеларускі зьлётскіх нацсаветаў калектывізаваны ад 50 да 80 проц.

На першым пасяджэньні з дакладам выступіў рэдактар газэты «Орка» тав. Прынц. У спрэчках прыняло ўдзел 10 дэлегатаў. У сваіх выступленьнях калгасьнікі гаварылі аб барацьбе польскага кулацтва і ксяндзоў супроць калектывізацыі польскай вёскі, супроць сацыялістычнага наступленьня. Кулакі і падкулачнікі прапазяюць у калгасы з мэтай узарваць іх знутры. Зьезд завастрыў увагу на задачах бязьлітаснай барацьбы, выкрыцьця і выгнаньня кулацкіх элемэнтаў з калгасаў.

Рад дэлегатаў указвалі на патрэбнасьць разгортваньня ў калгасах сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Зьлёт паслаў прывітальныя тэлеграмы VI усесаюзнаму зьезду саветаў, ЦК УсеКП(б), тав. Сталіну і ЦК КП(б)Б.

Аддзяленьне па рацыяналізацыі кіраўніцтва

Улічваючы вострую патрэбу ў падрыхтоўцы працаўнікоў рацыяналізацыі дзяржаўнага, адміністрацыйнага і гаспадарчага апарату — СНК пастанавіў рэарганізаваць рацыяналізатарскі цык ль аддзяленьня савецкага будаўніцтва факультэту савецкага будаўніцтва і права БДУ ў спэцыяльнае аддзяленьне гэтага факультэту па рацыяналізацыі кіраўніцтва. Аддзяленьне па рацыяналізацыі кіраўніцтва павінна падрыхтаваць рацыяналізатараў кіраўніцтва як для адміністрацыйных, так і гаспадарчых устаноў і прадпрыемстваў.

Работнікі Наркамгандлю—на кантрактацыю

Бюро партколектыву Наркамгандлю, абмеркаваўшы пытаньне аб ходзе кантрактацыі, пастанавіла мабілізаваць і паслаць у раёны для практычнай дапамогі ў правядзеньні кантрактацыі 50 проц. АДКАЗНЫХ РАБОТНІКАЎ. Бюро партколектыву выклікала ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ БЕЛКААПСАЮЗУ І НАРКАМЗЕМУ ПАСЬЛЕДВАЦЬ ГЭТАМУ ПРЫКЛАДУ.

На раёны ад ячэйкі Наркамснабу і яго аб'яднаньняў выяжджаюць каля 50 работнікаў. Тэрмін выезду работнікаў—10 сакавіка.

Паведамленьні

— **Менгарвомам КП(б)Б выклікаюцца КП(б)Б** на пасяджэньне прыймовай камісіі на 9-III-31 г., ў 6 гадз. веч., у пакой № 12, наступныя т. т.: Зяленскі В. М., Купінкі Б. Н. (Хэм. тэхн. ін-т), Самахвалаў С. Т. (палітэхнікум), Татаржыцкі С. М. (Нарсувязь), Кудраўцава Е. Д., Рэутаў Т., Чубкова П. І. (мэдінстытут), Косак С. Н. (п.-к. МЦРК), Гуцко А. А. (ВДУ), Лабавала Х., Д., (Мен. ваен. шпіталь), Гурбачоў (гарсавет), Дрэйзін Е. З., (Саюзкур), Грынфельд І. С. (Белдзяржбуд), Пішчыкава С. В. (ВДУ), Нісэнбаўм Б. А., Дазорцава Р. А. (Працасьветы). Вадэйка Я. С. (яч. ФЗУ), Лорман Г. Л. (Белдзяржбуд), Прудзнікоў Н. А., Дуброўскі І. К., Вараноўіч А. А., Пікус А. Я., Прымачоў А. Д., Аўраменка Г. А. (прыём) (шэфак), Сяльжевіч І. Я., Калінаўскі С. І., Левіт-Гурэвіч Н., Кленча Я. І., Гаўрылычык П. А., Дашкоўская В. С., Шастакова Г. М., Варгаўцік В. І., Гурэвіч М. М., Мінакер Ш. І., Пратасеня А. М., Талонка А. А. (рабфак), Оксман Х. Я., Ратінскі А. Н., Судзік М. А., Гендэльман І. Ш. (Наргас БДУ), Яблонскі П. У., Галкіна М. С. (Саўбуд і Права), сакратары памянёных ячэек і партколектываў павінны зьявіцца абавязкова.

— **Прыймовай камісіяй Менгаркому КП(б)Б выклікаюцца на пасяджэньне на 10-III-31 г., у 6 гадз. веч., у пакой № 12:** Эйдэльштэйн К. К., Кудляр І. С. Атлас З. Н. (друк. імя Сталіна), Андрыканец М. А. (Нарсувязь), Гарохаў М. Э. (рымарн. ф-ка), Пальянюк Е. Т., Любэцер В. М. (ф-ка «8 сакавіка»), Міткевіч А. Ф., Розэнбэрг Д. Е. (Хлебазавод), Канапацкі В. К. (Лошыцкая ячэйка), Багданава Е. М. (Волчкавіцкая ячэйка), Бляхер А. Л., Ганжын М. А., Фэдараў А. (Караліндчавіцкая ячэйка), Эльперын А. Е., Мінькоў К. В., Лаксін М. М. (ф-ка «Кастрычнік»), Лукін В. А. (ДПУ), Пень С. І., Русецкі М. С., Паўлаў М. М., Красьнікаў А. І. (шклозавод «Пралетары»), Даўгальцьява М. Ф. (Наркамзем), Вадзін І. С. (Палата мер і вагі), Фрыдлянд С. І. (пажарная камаида), Фішкін І. С. (ДПУ), Габрыловіч Л. П., Хмельнік Г. А. (зав. «Дрэваапрацоўшчык»), Станчанка С. А. (каўбасная ф-ка), Жаўнэрчык (дэпо. Менск МБВ ч.), Руткоўскі У. Я. (2-гі раён аховы МБВ ч.), Куновіч А. М. (сл. шляху ст. Менск МБВ ч.). Папоў Д. Ф. (дэпо МРВ), Красьнікаў Е. А. (зав. «Камунар»), Карабька Д. А., Блюдзе А. А. (Бел. дзярж. тэатр 2), Міланоўіч І. А., Шымко Ф. І., Цыбульскі А. І. («Полымя рэвалюцыі»), Кротаў А. Я., Варкун А. С., Рыжкоўскі В. Т., Макарчук А. Т. (зав. «Энэргія»), Цукерман В. (Абкамтрэст), Датлюк А. А. (пчотачн. ф-ка), Гарэлік М. А. (прафтэхшкола). Сакратары памянёных ячэек і партколектываў павінны зьявіцца абавязкова.

— **Культпроп Менгаркому КП(б)Б** на 12-е сакавіка г. г. склікае нараду ўсіх сакратароў партколектываў і ячэек прапагандыстаў—камунэтэрацыі, на пытаньні правядзеньня ўдарнага дня вучобы 15-га сакавіка, у памяшканьні **Гастраўдай залі** Камвузу. Яўка **выміпаказаных т. т.—абавязкова. Усім сакратарам** партколектываў не пазьней 9-га сакавіка прыняць залікі ў Культпроп Менгаркому аб колькасьці **необходных** ім прапагандыстаў для правядзеньня ударнага дня вучобы.

СЕНЬНЯ:

— **Дом Асьветы.** У 10 гадз.—вечар для асьветнікаў, прысьвечаны Міжнароднаму жаночаму дню.

У 19 гадз.—сход школьнай ячэйкі ЛКСМБ працасьветы.

ЗАЎТРА:

— **БДУ.** У 19 гадз., аўд. 116-а—адкрытае пасяджэньне катэдры палітэканоміі Наргасу БДУ. У парадку дня—даклад т. Ноткіна «Што такое рубіншчына». Запрашаюцца **навуковыя** прапаўнікі і студэнты факультэту Наргасу.

— У 20 гадз., у пам. анатамічнага корпусу—агульны сход прапаўнікоў мэд інстытуту. У парадку дня—даклад аб выніках пленуму ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б).

— **Бібкалектар.** У 11 гадз. веч., у пам. бібкалектараў (плян Волі, Дом Працы)—бібліяграфічная група па разборы яўрэйскай літаратуры. Уступнае слова аб кнізе Фефера «Генэты» зробіць т. Дунец. Запраш. бібліятэкары, работчыя, письменьнікі і настаўнікі.

— **БАН.** У 7 гадз. веч., у памяшк. залі БАН катэдрай марксізму і ленінізму сумесна з ОВМД будзе заслухан даклад т. Левіна на тэму: «Метадалогія трацкізму». Уваход вольны.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 23.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	4-27	Сэктар сец. земл.	6-1
Сакратар	10-14	Сэкт. саўбуд.	6-19
Партсэктар	13-80	Замоўны інфарм.	6-19
Прам. сэктар	13-80	Начны рэдактар	6-4

Прыём тэлефонаграм і інвэнарная перадача 10-74

Умовы падпіскі
(з дарожным дадаткам „Два руху")

На 1 мес.	— 1 р.
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок нонп. пасьля тэксту — 1 р., ін. на гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. Кампанэнт ы рахунак выдаецца. № 52[illegible] у Дзярж. банку

Абвесткі прымаюцца ў кантары выдавецтва „ЗВЯЗДА" Менск, Савецкая 23, 2-а паверх, тэл. 7-31.

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ

У аўторак 10-га сакавіка, у 6 г. веч. у памяшканьні клюбу імя К. Маркса склікаецца

агульна-гарадзкі сход партыйнага актыву разам з рабкорамі г. Менску

У ПАРАДКУ ДНЯ ДАКЛАДЫ: Вынікі Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху і задачы партыйнага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам. Даклядчыкі—прадстаўнікі газэты «Праўда» і Культпропу ЦК КП(б)Б.

Уваход па білетах, якія распаўсюджваюцца Гаркомам КП(б)Б.

Білеты, ячэйкі разасланы на 6-III, сапраўдны на 10 сакавіка.

Члены ЦК і ЦКК КП(б)Б, члены і канд. Гаркому і Гар.КК, члены бюро ЦК і ГК ЛКСМБ, чл. фр. ЦВК, ЦСПСБ, Гарсавету і ЦК и аўсаюза праходзяць па сваіх мандатах.

Менгарком КП(б)Б.

Кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

З ПАНЯДЗЕЛКА, 9 САКАВІКА
Новы мастацкі фільм вытворчасьці ленінградзкай ф-кі СЮЗКІНО

НА ТЫМ БАКУ

Драма ў 7 ч. Паводле аднайменнага раману ВІКТАРА КІНА
Рэжысэр Б. Казакоў. Сцэнары В. Нядобрага. Аператар А. Братуха.
У ГАЛОЎН. РОЛЯХ: Н. Шатэрнікава, Градаполаў, Курэкор, Гардзін, Канна і інш.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
КІНО-ХРОНІКА САЮЗКІНО № 4 за 1931 г.

Штодзенна—3 сэансы.
Пачатак 1 сэансу ў 7 г. 2 с.—у 8 г. 45 м. і 3 с.—у 10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 5 гадз.
Папярэдні продаж білетаў у тэатр. раб. касе.
Асобы, якія опозьняцца на сэанс не дапускаюцца.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРД"
З панядзелка, 9-га сакавіка
НОВЫ САВЕЦКІ ФІЛЬМ З ЭПОХІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ
АПАЙКА
РЭЖЫСЭР Максімаў-Кошінскі
(——) У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: (——)
Таня Юн, Цітаткаў, А. Калеоўіны
Звыш праграмы
ЗА ЎСЕНАВУЧ
у 1 частцы
Пачатак сэансаў у 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. Каса — з 5 гадз.
Асобы, якія спазьніліся, на сэанс не дапускаюцца.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
з панядзелка, 9 сакавіка
Монці Бэнкс
У ЛЕПШАЙ ЗАМЕЖНАЙ КАМЭДЫІ
ПАДКОВА ШЧАСЬЦЯ
у 6 частках.
Штодзенна 4 сэансы.
Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз., 2-га—7 г. 30 м., 3-га—9 гадз., 4-га—10 гадз. 30 м.
КАСА адкрыта з 4 гадз. веч.

Сеньня, 9 САКАВІКА АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ
Пач. а 9 гадз.
Беларускі другі дзяржаўны тэатр
В. Кіршон.
РЭЙКІ ГУДУЦЬ
Пьеса ў 5 дзеях, 12 абразох.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
З панядзелка, 9 сакавіка
савецкі фільм
ГАМБУРГ
драма ў 8 частках з пралёгам.
Сцэнары—С. Шрайбэр, Ю. Яноўскага.
Рэжысэр—В. Балюзэк.
У галоўных ролях:
Г. Спранцэ, К. Горык, К. Заладная, І. Замычкоўскі, Я. Рэйніч.
ПАЧАТАК 1-га сэансу ў 6 г. 30 м.
КАСА—з 4 гадз. 30 м.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
З панядзелка, 9 сакавіка цікавы фільм
1.
ДЖЭНТЛЬМЭН І ПЕВЕНЬ
Арытмічная камедыя ў 6 частках.
2.
БУНТ ЗУБОЎ
культур-фільм у 2-х частках.
Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня.
Каса адкрыта з 12 гадз. дня.

КІНО „СПАРТАК"
З панядзелка, 9 сакавіка
НА ЭКРАНЕ ІГАР ІЛЬЛІНСКІ
у карціне
Калі прабуджаюцца мёртвыя
камедыя ў 7 частках.
Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
КА А-З 5 ГАДЗ.

10 САКАВІКА, у 7 гадз. веч., у памяшк. клюбу імя Дзяржынскага (Рэвалюцыйная, 2)
АДБУДЗЕЦЦА
пасяджэньне камісіі па чыстцы апарату ЦК т-ва Чырвонага крыжу,
з парадкам дня:
даклад аб дзейнасьці ЦК т-ва.
На пасяджэньне запрашаюцца рабочыя і брыгадзіры лямцавай ф-кі «Кастрычнік», рабочыя і работніцы прадпрыемстваў г. Менску, члены т-ва Чырвонага крыжу і працаўнікі устаноў і прадпрыемстваў т-ва.

10 сакавіка, у 7 гадз. веч., у памяшк. БАН (рог Ленінскай і Ўніверсытэцкай, 29-35, у залі пасяджэньняў БАН)
ПОЛЬСЭКТАР БАН
СКЛІКАЕ
пашыраную нараду
ПА ПЫТАНЬНІ
РЭФОРМЫ ПОЛЬСКАГА ПРАВАПІСУ
Запрашаюцца прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых устаноў, а таксама таварышы рабочыя і асьветнікі палякі.

УСІМ зацікаўленым асобам і брыгадам,
былучаным у камісію па барацьбе з пасудзой
ЗЬЯВІЦЦА 10 САКАВІКА,
у 12 гадз. дня, у памяшканьне Камгасу
НА СХОД.

ЗЬЛВОД звяртае увагу ўсіх дэманстрацыйствуй, каб
пры скідваньні з даху сьнегу,
апошні не кідаў на правады электрастэнц. каб не было абрыву праводаў, аварый на сетцы і пашкоджаньня сьвятла цэлых сяёнаў гораду.
Адказнасьць і страты, зьвязаныя з абрывам праводаў будуць усталёваны на дэманстрацыйствы, якія ня прынялі мер перасьцярогі пры скідваньні сьнегу з даху.

ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЕ АСЬВЕТЫ імя Карла Маркса
11 сакавіка, ў 7 гадз. веч.—адбудзецца даклад т. Югава
«Расійскі меншавізм на службе міжнароднай буржуазіі»
(Да працаду „Саюзнага бюро меншавікоў")
Білеты ў гаркоме КП(б)Б і па ячэйках.

Агульна гарадзкая нарада рацыяналізатараў
ПА ПЫТАНЬНІ
аргмінімуму № 1 сыстэма адказных выканаўцаў (праект з Масквы)
адбудзецца сёньня, а 7 гадз. увечары ў памяшканьні НК РСІ (Савецкая 55, 3-ці паверх, пакой 11)

СЕНЬНЯ, у 6 гадзін вечара, у прыродазнаўчым корпусе (аўдыторыя № 2, Ўнівэрсытэцкі гарадок)
Камісія ЦКК РСІ па чыстцы і праверцы Беларускай Акадэміі Навук
СКЛІКАЕ
СХОД СТУДЭНТАЎ
сумесна з рабочымі
па праглядзе дзейнасьці катэдры зоалёгіі БАН.
На сход запрашаюцца навуковыя працаўнікі БАН, БДУ, выкладчыкі тэхнікумаў і настаўнікі.

У аўторак, 10 сакавіка, у 8 гадз. веч., у клюбе саўгандальслужачых,
ЦП САЮЗУ СГС
СКЛІКАЕ КАНФЭРЭНЦЫЮ
працаўнікоў Белкаапсаюзу, МЦРК, ТПО, МБВ і Заклярэбу
З ПАРАДКАМ ДНЯ: 1) Аб выніках 2 сэсіі Белкаапсаюзу (дакл. т. Шэйнін). 2) Аб ходзе выкананьня фінпляну за першы квартал па МЦРК (дакл. т. Флеер).
Яўка дэлегатаў ад працаўнікоў БКС, МЦРК, ТПО і Заклярэбу абавязковая.
Запрашаюцца рабочыя, што шэфствуюць над каапэрацыйнымі ўстановамі, прадстаўнікі Наркамгандлю, гарсавету і прадст. рэдакцыі газэт.

Кіраўніцтва кадраў гор. Менску
даводзіць да ведама, што з 7-III-31 г. па 15-III-31 г.
АДКРЫТ
ПРЫЁМ НА КУРСЫ ЦІП'У
інструктароў-мастаўшчыкоў
на 12 месц.
На курсы прымаюцца рабочыя, члены саюзу, кваліфікаваныя мастаўшчыкі.
Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй у суме 130 руб. у м-ц.
Тэрмін навучаньня адзін мес.
Пасьля сканчэньня курсаў інструктары накіроўваюцца на работу ў раёны па падрыхтоўцы рабсілы.
ЗАЯВЫ ПРЫМАЮЦЦА ў сэктары кадраў штодзенна да 15 сакавіка 1931 г. з 9 гадз. да 11 гадз. дня.

Калгасьнікам, аднаасобнікам—беднякам, батракам і серадняком Беларусі, што раней працавалі ў капальнях

Даводзіцца да ведама, што ПРАУЛЕНЬНЕМ „УГОЛЬ" І НАРКАМПРАЦЫ БЕЛАРУСІ

ПРАВОДЗІЦЦА ВЯРБОЎКА ВУГЛЯКОПАЎ,
ШТО РАНЕЙ ПРАЦАВАЛІ Ў КАПАЛЬНЯХ.

ЖАДАЮЧЫМ ЕХАЦЬ ПРАЦАВАЦЬ у капальнях на падземныя работы пастановай ураду прадастаўляюцца ЛЬГОТЫ: для калгасьнікаў, аднаасобнікаў—беднякоў і батракоў. Рабочыя-вуглякопы, якія закантрактаваліся на падземныя работы ў горнай прамысловасьці, на менш году карыстаюцца наступнымі льготамі, устаноўленымі СНК СССР:
а) З незабагуленай часткі гаспадаркі калгасьніка сельгаспадатак не спаганяецца.
б) Калгасьнікі, якія закантрактаваліся, адлічваюць у карысьць калгасу 2 проц. (замест 3—10 проц.).
в) Члены сям'і закантрактаванага калгасьніка карыстаюцца дапамогай калгасу (прадастаўленьне інвэнтару для апрацоўкі сядзібнага агароду, прадастаўленьне фурманкі нароўні з іншымі членамі калгасу).
г) Сям'я закантрактаванага калгасьніка задавальняецца прадуктамі з калгаснага вытворства з асобнага харчовага і кармавога фонду ў разьмерах ня менш чым атрымліваюць члены сям'і калгасьнікаў, якія добрасумленна працуюць у [illegible] гах.
д) Члены сям'і закантрактаванага калгасьніка маюць перавагу пры паступленьні ў школы, на курсы атрыманьня [illegible] кацыі.
з) Аднаасобнікаў, якія выказалі згоду працаваць у капальнях і закантрактаваліся на падземныя работы на менш як на год, сельгаспадатак не спаганяецца.

Апрача таго з 15 лютага гэтага году праведзена ПАВЫШЭНЬНЕ ЗАРПЛАТЫ ў наступным разьмеры:

ПРАФЭСІЯ	Тарыфная стаўка за рабочы дзень	ПРАФЭСІЯ	Тарыфная стаўка за рабочы дзень
Машыністы ўрубавых машын	5 р. 25 к.—5 р. 75 к.	Перавосчыкі канвэраў	3 р. 20 к.
Пам. машыністаў урубавых машын	4 р. 50 к.	Машыністы канвэраў	2 р. 85 к.
Забойшчыкі на адбойных малатках	5 руб.	Машыністы скрыпераў	3 р. 20 к.
Забойшчыкі ўручную	4 р. 50 к.	Копагоны падземныя	3 р. 20 к.
Зарубшчыкі	4 р. 50 к.	Будчыкі народы	3 руб.
Адбойшчыкі ўручную машынных лавах	4 р. 50 к.	Лесагоны	2 р. 50 к.
Навальшчыкі на канвэрных скрыперах	3 р. 50 к.	Слесары падземныя	3 р.—4 р. 50 к.
Крапільшчыкі	3 р.—4 р. 50 к.	Плітавыя	2 р.—2 р. 50 к.
Бурыльшчыкі па народзе	3 р. 85 к.	Вагоншчыкі з нагрузкай уручную	3 р. 20 к.
Бурыльшчыкі па вугалю	3 р. 50 к.	Вагоншчыкі в над люкаў	3 руб.

Усе работы праводзяцца вызьвольна і набр гадна. Праезд па чыгунцы рабочых, што едуць у капальні—за кошт «Угля» у жорсткім вагоне без пляцкарты. Калі ад месца да станцыі адпраўленьня перавышае 3 кілёметры, дык аплачваецца перавозка багажу, а калі перавышае 10 кілёматраў, дык аплачваецца праезд самога рабочага. Са дня адпраўленьня рабочага з месца яго жыхарства да прыступленьня да працы яму выплачваецца ў дзень па 2 р. 50 к. сутачных на харчаваньне—за 10 т праз прыемства. На прыездзе на месца працы рабочаму прадастаўляецца цалкам прыгоднае, абсталяванае для жыцьля памяшканьне з васьпельнымі прыладамі. Таксама рабочыя вуглякопы забясьпечваюцца харчаваньнем.

Жадаючыя ехаць для работы ў капальні Данбасу павінны зьявіцца да Інспэктара працы бліжэйшага раёну яго месцажыхарства для запісу і медагляду на прадмет выезду ў Данбас, васьля чаго агент «Угля» накіроўвае на капальні, куды вярбуюцца рабочыя-вуглякопы.

Вярбоўцы падлягаюць калгасьнікі, батракі, беднякі і сераднякі, якія могуць заключыць з агентамі «Угля» дагавор на кірмія працы ў капальнях.

Наркампрацы БССР. Калгасцэнтр БССР. Упаўнаважаны аб'яднаньня «УГОЛЬ».

Менск. Друкарня «Зьвязды».

Менск. Галоўлітбел № 397